# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Новы дыск „РІМЫ” ☞ 8

На Гайнаўшчыне ☞ 3

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 36 (2782) Год LIV | Беласток, 6 верасня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

# Захаваць памяць

Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

— Яўрэйскія могілкі? Яны хіба там, першая вуліца налева. Але дакладна не ведаю. Жыву тут 30 гадоў, але ніколі там не была, — такі адказ чую ад жыхаркі Крынак, у якой мы спыталіся, як трапіць на тутэйшы кіркут.

Мае пошукі яўрэйскіх могілак невыпадковыя. Якраз вяртаюся з Лапіч, дзе сваю базу маюць удзельнікі міжнароднага студэнцкага лагера, якія ўжо другі год запар наводзяць парадак на крынкаўскім кіркуце.

## Аднаўляюць і збіраюць успаміны

— Наш лагер гэта працяг дзеянняў, якія пачалі мы ў мінулым годзе, — тлумачыць Філіп Паздэрскі, арганізатар лагера, старшыня Аб’яднання ў падтрымку Падляшскай зямлі „Друмля”. — У мінулым годзе прыбралі мы значную частку кіркута і аднавілі сінагогу. Зараз працягваем гэтыя дзеянні.

Апрача гэтага ўдзельнікі сёлетняга летніка — студэнты з Польшчы, Нямеччыны і Беларусі — дакументуюць надпісы на магілах, стараючыся адчытаць прынамсі прозвішча пакойніка і дату пахавання.

— Другая частка нашай працы гэта размовы з жыхарамі навакольных мясцовасцей. Пытаем як у мінулым выглядала жыццё. Асабліва цікавяць нас суадносіны паміж прадстаўнікамі розных культур, якія тут існавалі, — тлумачыць Філіп.

Адзначае ён, што як у мінулым, так і ў гэтым годзе не сустрэліся яны з адмоўным стаўленнем з боку жыхароў да таго, чым студэнты займаюцца. Наадварот, у размовах з мясцовымі вельмі часта чуюць словы падтрымкі для сваёй дзейнасці.

Матэрыялы, сабраныя на працягу двухгадовай працы, і вынікі даследаванняў будуць выдадзены друкам.

— Яшчэ ў гэтым годзе плануем публікацыю, у якой змесцім усё, што ўдалося нам сабраць, — тлумачыць Філіп.

## Тутэйшыя людзі не адчуваюць сябе беларусамі

У лагеры, арганізаваным Аб’яднаннем „Друмля”, прысутнічае 20 маладых асоб, якія адгукнуліся на заявы, змешчаныя ў інтэрнэце. Удзельнікі летніка гэта студэнты розных спецыяльнасцей, розных курсаў.

— З аб’яднаннем „Друмля” ўжо на працягу трох гадоў рэалізуем супольныя праекты, — тлумачыць Андрэй Стрыжак з Гомельскага дэмакратычнага форуму. — Першым з іх быў праект „Дыялогі з суседзямі”. У рамках яго ў 2007 годзе супольна з палякамі і немцамі высвятлялі мы агульнае і рознае асэнсаванне Грунвальдскай бітвы.

Сябры Гомельскага дэмакратычнага форуму ў мінулым годзе прысутнічалі таксама ў першым крынкаўскім летніку.

— Сёлетні лагер гэта ўжо наша чацвёртае супольнае дзеянне, — дадае Андрэй.

Запытаны аб уражанні з пабыўкі на беларускіх землях у Польшчы Андрэй Стрыжак тлумачыць, што калі прыехаў сюды ўпершыню, вельмі ўразіла яго, што людзі, з якімі размаўляеш па-беларуску і якія адказваюць табе на гэтай мове, не прызнаюцца да беларускай нацыянальнасці.

— Яны не суадносяць сябе з паняццем беларускасці. Гавораць, што яны „тутэйшыя”, што гавораць „папростаму”, „па-свойму”. Не ведаю з чаго гэта вынікае. Мабыць, прычыны сягаюць яшчэ пачаткаў XX стагоддзя.

Цікава, што пра беларускае асяроддзе ў Польшчы Андрэй даведаўся толькі ў 2007 годзе, калі даваў інтэрв’ю беларускай рэдакцыі польскага тэлебачання. Тады пачуў больш пра беларускую меншасць у Польшчы, яе дзеянні, арганізацыі.

Падчас фізічнай працы шматнацыянальнасць удзельнікаў лагера не з’яўляецца прычынай ніякіх цяжкасцей. Аднак падчас размоў з жыхарамі трэба больш папрацаваць.

— Часам чалавек пачынае гаварыць з намі па-беларуску і гэта складана для перакладчыка, які тлумачыць немцам, бо ведае толькі польскую і расейскую мовы, — кажа Андрэй.

Але ўсё-такі канчаткова ўдаецца ўсім зразумець змест расказаў і размоў.

## „Друмля” пачалася ў Крынках

— З Крынкамі цесна звязана паўстанне нашай арганізацыі, — гаворыць Філіп Паздэрскі запытаны чаму якраз сюды накіравала свае дзеянні Аб’яднанне ў падтрымку Падляшскай зямлі „Друмля”.

Аднойчы зімой Філіп, якога бабуля жыве ў Беластоку, наведаў Падляшша разам з сябрам. Прыехалі яны і ў Крынкі, дзе наведалі занядбаныя яўрэйскія могілкі.

— Вярнуліся мы ў Беласток і сцвердзілі, што можна было б нешта зрабіць, а не толькі наракаць, — тлумачыць старшыня Аб’яднання „Друмля”. — Падчас летніх канікул прыехалі мы сюды з групай сяброў парадкаваць кіркут. Пасля вяртання ў Варшаву сабраліся мы і рашылі заснаваць арганізацыю.

Пасля сябры новага аб’яднання знайшлі інфармацыю аб праграме „Меморыя — валантарыят для еўрапейскай культурнай спадчыны”, арганізаванай Фондам Баторыя ды нямецкім фондам „Памяць. Адказнасць. Будучыня” і рашылі напісаць праект на дафінансаванне сваіх дзеянняў у Крынках. Сёлетні і мінулагодні летнікі фінансаваны якраз са сродкаў гэтай праграмы.

— Калі наведаць яўрэйскія могілкі, эфекты нашай працы на іх відавочныя, — гаворыць Філіп.

Каб паказаць мясцовым жыхарам чым займаліся ўдзельнікі летніка, у перадапошні дзень лагера, 29 жніўня, наладзілі яны сустрэчу, падчас якой прадставілі плён іхняй дзейнасці ў Крынках і наваколлі на працягу двух гадоў.

Заахвочаны расказам Філіпа, рашаю пакінуць лагер і падацца ў Крынкі, каб на свае вочы пабачыць адноўлены кіркут. Тым больш, што праз хвіліну ўдзельнікі выпраўляюцца веласіпедамі ў навакольныя вёскі, каб надалей браць інтэрв’ю ў тутэйшых жыхароў.

А на яўрэйскія могілкі ўдалося мне ў рэшце рэшт трапіць дзякуючы... інтуіцыі і шчасцю.


## Эра эгаізму ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Характэрная з’ява — гэта стаўленне ў беларускім грамадстве да дзяцей. З аднаго боку — у нас зараз маладзетныя сем’і, а з іншага — вялікая колькасць дзіцячых дамоў. Ці ж нармальна гэта? А, прыкладам, у той жа Грузіі, якая ў найноўшы час перажыла некалькі войнаў і грамадзянскай варажнечы, няма сірот...

## Адкрываем Падляшша ☞ 4

Віктар БУРА

## Фестывальная разнароднасць ☞ 5

Аляксей МАРОЗ

## У Мастаўлянах (2) ☞ 12

Ганна КАНДРАЦЮК

# Эра эгаізму

Апраўдваючы свае дзеянні і паставы, людзі часцяком любяць казаць: „такое жыццё, такі свет, што я магу зрабіць", „усе так робяць, усе так жывуць". Гэтая ўніверсальная формула маны іншым, а пры тым і самападману, прыводзіць да сталага ўстойлівага канфармізму з рэчаіснасцю, з заганнымі парадкамі, да абыякавасці і звыкласці з паўсядзённымі несправядлівасцю і злом. Зямны камфорт становіцца найважнейшай мэтай жыцця і чалавеку ўжо цяжка збочыць з вызначанай каляіны, змяніць сваё ўспрыманне рэчаіснасці і рэагаванне на яе.

Гаворым тут, канешне, найперш пра Беларусь. Хоць у прынцыпе псіхалогія людзей усюды аднолькавая, але супольнасці існуюць розныя, бо акрамя чалавечай прыроды, схільнай да кепскага, важкую ролю граюць выхаванне і традыцыі. Калі яны страчваюцца — нацыя гіне. Найперш дэградуе маральна, а потым спакваля вымірае і фізічна. Характэрная з'ява — гэта стаўленне ў беларускім грамадстве да дзяцей. З аднаго боку — у нас зараз маладзетныя сем'і, а з іншага — вялікая колькасць дзіцячых дамоў. Ці ж нармальна гэта? А, прыкладам, у той жа Грузіі, якая ў найноўшы час перажыла некалькі войнаў і грамадзянскай варажнечы, няма сірот. Тое ж на ўсім Закаўказзі. Дзеці, якія па розных прычынах засталіся без бацькоў, адразу ўсынаўляюцца альбо сваякамі, альбо зусім чужымі людзьмі. Па-іншаму прадстаўнікі гэтых народаў не могуць, бо дзеці — гэта святое, самае дарагое, асабліва ў невялікай нацыі. Таму і няма ў гэтых краінах дзіцячых дамоў зусім. У нас жа кінуць сваё дзіця — хворае ці нават здаровае — справа досыць распаўсюджаная. Людзі звыклі жыць найперш для сябе. Жанчыны, якія ўжо маюць адно дзіця, лічаць сваю зямную місію выкананай і, як правіла, самі вырашаюць больш не нараджаць. Становіцца не важна, што гэта супярэчыць хрысціянскім традыцыям, маўляў, зараз зусім іншы час. У гэтым сэнсе набліжаемся да сучаснай Еўропы, якая мае падобныя стандарты. Толькі чамусьці бярэм з Еўропы якраз горшае, што там ёсць. Яшчэ гадоў шэсцьдзесят-семдзесят таму мысленне было зусім іншым, нараджалі і ў вайну, і ў галодны час — па пяць-шэсць дзяцей. Рознае здаралася, але сем'і былі куды больш трывалымі, з'яднанымі. І вось як перавярнуліся мазгі за апошні гістарычны перыяд.

Тое самае і беларускія мужчыны, якія няздольныя ўзяць на сябе адказнасць і не хочуць працягваць род. Пры гэтым людзі, апраўдваючы свой звычайны эгаізм, нясуць усялякую лухту кшталту „няма чаго пладзіць жабрацтва", „як тут пракорміш тое дзіця" і таму падобнае. Але бальшыня з іх жыве зусім не бедна, купляе новыя машыны, кватэры, літаральна вар'яцее на розных рамонтах, спаборнічае з суседзямі ў каго больш прэстыжныя і модныя мэбля і адзежа, ездзіць адпачываць на дарагія курорты. Чалавек не хоча нават думаць пра тое, што само па сабе матэрыяльнае багацце не мае аніякай каштоўнасці. Мяшчанства паглынае людскія душы, пра тое каб памагчы бліжняму няма і гаворкі. Культ фальшывага дабрабыту, культ рэчаў пануюць у грамадстве. Абы ўрваць паболей сабе, асабліва коштам іншых, абы падмануць, абы было выгадна — прычым зараз, тут і цяпер. Якая ўжо тут грамадская салідарнасць? Таму і жыве так беларуская нацыя. Зайздрасць, скупасць, прагнасць — вось асноўныя кіты, на якіх стаіць светапогляд, рысы, якія вызначаюць сутнасць нашага чалавека. Ніхто не кажа, што чалавек не мае права жыць заможна і нават багата. Ведаю і такіх, якія зарабіўшы немалыя грошы, дасягнуўшы забяспечанага матэрыяльнага стану, засталіся найперш нармальнымі людзьмі, чулымі на патрэбы іншых і гатовымі прыйсці на дапамогу. Але гэта, хутчэй, адзінкавыя прыклады, выняткі з правіла пакланення найперш залатому цяльцу.

Сучаснаму свету патрэбныя як ніколі спагада, зычлівасць, шчодрасць душы, ахвярнасць дзеля іншых. Але пакуль замест эры міласэрнасці, пра якую марыў літаратурны герой, надышла і пануе эра эгаізму.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Пушчанскі мёд

Пацягнула мяне ў суботу 22 жніўня ў Тыкоцін на Мядовую бяседу. Да мёду цягнецца ўсё, бо мёд спрадвеку мае выключна станоўчыя асацыяцыі. Ужо Майсей выводзіў свой народ „у добрую і прасторную зямлю, дзе малако і мёд цякуць". Мёд, мабыць, лічыўся нават адной з асноў жыцця, бо колішняе звычаёвае борцевае права на нашых землях лічыла адніманне некаму мёду раўнёю адніманню жыцця. Вось што пра гэты закон паўтысячагадовай даўнасці пісаў Зыгмунт Глогер: „Według prawa bartnego, najsurowsza kara, bo gardłowa, przez powieszenie, dotykała złodzieja, wydzierającego pszczoły z barci, lecz tylko w razie jeżeli na gorącym uczynku schwytany został. Na wydanie wyroku śmierci zwoływał podstarości wszystkich bartników do miasta, gdzie sąd bartny zasiadał (...), a przed wykonaniem wyroku wszyscy bartnicy powinni byli dotknąć się ręką powrozu, na którym złoczyńca miał być powieszony".

Мядовая бяседа гэта нешта накшталт дажынак, гэта завяршэнне збору вельмі важнага плёну. Толькі „жнеямі" гэтага ўраджаю бываюць працавітыя пчолкі; але не толькі звычайнымі збіральніцамі тых скарбаў, якія родзіць сваім усім насельнікам наша зямелька-маці. Мёд здаўна лічыцца панацэяй ад усялякіх хвароб, і то такім гаючым сродкам, на які непатрэбныя рэцэпты, які не занесены ў рэфундацыйныя спіскі, за якім не трэба чакаць у гадовай працягласці чэргах да спецыялістаў у белых халатах, таму і згаданыя пчолкі трэба лічыць і „магістрамі", што рыхтуюць такія знакамітыя гаючыя сродкі, і „дактарамі", і лятаючымі з уколамі „медсёстрамі"; цікава, ці слова „медыцына" не выводзіцца ад мёду, на падабенства этымалогіі слова „мядзведзь", якое склалася са слоў „мёд есць".

Мядовая бяседа ў Тыкоціне была своеасаблівымі дажынкамі і таму, што там прэзентаваўся шырокі веер тых фінальных вырабаў, тых плёнаў чалавечай выдумкі, якія служаць сыравінай для функцыянавання нашых арганізмаў. Значыць былі там розныя ласункі, не толькі салодкія, не толькі печыва, але і мясныя вырабы традыцыйнай рэцэптуры. І ўсё гэта было так пахотнае нюхам, так прывабнае відам, што — як той траянскі конь — прадстаўляла проста непасільна разрушальную прынаду страваводам...

Шчасліва, гэтыя прывабныя капканы былі на акраінах, а ў цэнтры, вакол помніка гетману Чарнецкаму, занялі пазіцыі ларкі з мёдам, быццам рыхтуючыся пад камандаваннем славутага палкаводца даць адпор акружаючым пагрозам. Былі там ларкі пчалаводаў з недалёкага наваколля, у тым ліку з Саколкі, Васількава, сідранскай Саломянкі, арлянскіх Міклашоў, кляшчэлеўскіх Сакоў ды гайнаўскага Старога Беразова. І ўсе гэтыя вытворцы вельмі важныя. Чаму? Бо, як сказала прафесар Марыя Бараўская, мядовая сустрэча ў Тыкоціне прапанавала высакаякасныя мяды, праверанныя ў лабараторыях. Вось тая лабараторная праверка і паказала іх выдатныя гаючыя параметры, а не ўсюды такая праверка праводзіцца.

Мёд з'яўляецца ўніверсальным лекам, аднак жа яго розныя дэрывацыі, залежныя ад раслін, дзе працавалі пчолы, маюць і спецыялістычны напрамак уздзеяння. Рапсавы мёд варта прымаць для гаення недамогаў печані, сэрца і дыхальных органаў; акацыевы — на страваводі і мачавод; ліпавы — на прастуды, дыханне, сэрца, нервы; грэчкавы — кровазварот, печань, дэтаксікацыю, анемію, дыханне; верасовы — мачавод, горла, страваводі; малінавы — прастуда, страваводі, анемію, артэрыясклероз; падлескавы — алергію, стому, сэрца; падзевы — дыханне, страваводі (запоры, паносы), сэрца, нервы; васільковы — мачавод; дзьмухаўцавы — страўнік, кішкі, мачавод, печань.

Маю ўвагу прыцягнуў ларок з адмысловай шыльдай, напісанай яловымі і сасновымі шышкамі; ларок гэты — спадарства Аўласюкоў са Старога Беразова — прапанаваў мёд проста з Белавежскай пушчы. Але ж Старое Беразова ад пушчы ў некалькіх кіламетрах, як жа беразоўскія пчаляры могуць падшывацца пад пушчанскія пчолы, пасумняваўся я. Спытаў я пра гэта спадара Аўласюка і даведаўся, што ягоная пасека стаіць у запаведніку — такая дамова паміж ім і дырэкцыяй парку. Вось адтуль і бярэцца той найчысцейшы мёд, да якога не дастаюцца розныя мінеральныя прымесі, якімі сяляне фертылізуюць свае палі; сам я смакаваў: мёд ад Аўласюкоў — пальчыкі абліжаш! Шыльды ў Старым Беразове ў іх няма, але ж людзі скажуць іх адрас, дзе можна абзавесціся гэтай знакамітай панацэяй!

**Аляксандр ВЯРБІЦКІ**

**Вачыма еўрапейца**

## Даз'ездавая дылема

Праз некалькі дзён пачнецца з'езд Саюза палякаў Беларусі, кіраванага Юзафам Лучнікам і — далікатна кажучы — альтэрнатыўнага іншаму СПБ, на чале якога стаіць Анжаліка Борыс. У сувязі з гэтым з'ездам адзін знаёмы спытаўся ў мяне, ці мо я выбіраюся на яго як журналіст-назіральнік, а калі так, ці не будзе гэта легітымізацыя польскіх дзеячаў у Беларусі, падтрымліваючых рэжым Аляксандра Лукашэнкі, і здрада польскім дзяржаўным інтарэсам, бо г.зв. афіцыйныя польскія кіруючыя фактары падтрымліваюць Борыс і не адабраюць старшыню СПБ Юзафа Лучніка. Я адказаў яму, згодна з праўдай, што не паеду. Мой пашпарт страціў сапраўднасць, дарэчы, не быў ён актуальны таксама ў сакавіку гэтага года ў час з'езду Саюза старшыні Борыс. Тым не менш стаў я задумвацца над тым, што я зрабіў бы, калі б той дакумент быў у мяне на руках і ці журналісты з Польшчы павінны „абслугоўваць" з'езд СПБ Юзафа Лучніка. Так неяк склалася, што тымі дылемамі я падзяліўся з журналістамі з іншых беластоцкіх СМІ. Самай цікавай здалася мне думка праграмнага кіраўніка Радыё Беласток Барбары Баярын:

— Журналісты з Польшчы павінны ехаць на кожны з'езд Саюза палякаў Беларусі. У гэтым выпадку журналісты не павінны займаць нейкай уласнай палітычнай пазіцыі. Варта таксама ўрэшце высветліць, у чым сапраўды заключаецца канфлікт паміж Анжалікай Борыс і Юзафам Лучнікам, і ці гэты канфлікт пераносіцца на стасункі паміж самымі палякамі ў гэтай краіне. Найважнейшым з'яўляецца прадстаўленне рацыі абодвух бакоў.

У сваю чаргу старшыня Борыс, у якой я спытаўся, ці журналісты з Польшчы мо павінны збайкатаваць з'езд яе „канкурэнта", адказала коратка:

— Гэта справа польскіх журналістаў. У Польшчы ёсць дэмакратыя і кожны можа сам вырашаць, паводле свайго сумлення.

Пры нагодзе я спытаўся ў пані Борыс, што будзе далей з яе саюзам пасля з'езду арганізацыі Юзафа Лучніка. Пачуў:

— Гэта залежыць ад улад. Ад 2005 г. [адбыліся тады з'езды абодвух саюзаў — М. Х.] дэкларуем ахвоту дыялогу з уладамі.

Згодна з інфармацыямі старшыні Борыс, польскіх дзеячаў з глыбінкі Беларусі, якія не хочуць прымаць удзелу ў найбліжэйшым з'ездзе, запалохваюць. Адказваючы на пытанне, ці Юзаф Лучнік уратаваў Саюз палякаў Беларусі, сцвярджаюць яны так, як Часлава Бужынская, дзяячка аддзела СПБ (Анжалікі Борыс) у Сапоцкіне:

— Ён здрадзіў нам усім, палякам! Лучнік заўсёды думае толькі аб сабе.

Або, як Аліцыя Галустава, старшыня аддзела СПБ у Віцебску:

— Ён знішчае шматгадовыя здабыткі гэтых людзей. У гэтага чалавека хворыя амбіцыі, усіх палівае граззю.

Аляксандр Дварэцкаў са Згуртавання польскай моладзі пры СПБ:

— Мяркуючы па выніках іх працы, якіх, на жаль, я не бачу — не ўратаваў. Вечарамі, праходзячы каля Польскага дома, не бачу там нават уключанага святла. Здаецца, там мёртвае каралеўства. Дом заўсёды бурліў жыццём. Дзверы не зачыняліся, не было нават месца, каб сесці.

Выглядае на тое, што сам Юзаф Лучнік абражаны на польскія ўлады. У адным з інтэрв'ю ён сказаў:

— Я мяркую, што палітыка польскага ўрада ў адносінах да паўтарамільённага народа польскага паходжання ў Беларусі не ўзгодненая з гэтым народам, гімнам [!? — М. Х.] якога з'яўляюцца словы: „Nie rzucim ziemi skąd nasz ród".

Калі так услухоўваюся ў гэтыя думкі аднаго і другога боку, даходжу да вываду, што можа гэта і добра, што няма ў мяне актуальнага пашпарта і што працую ў „Ніве", тыднёвіку беларусаў у Польшчы.

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# Як чынам захочацца

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Выходжу на аўтобусным прыпынку... А той прыпынак называецца „STARY BEREZÓW", хаця я браў білет у Старое Беразова. Але блізенькі дарожны паказальнік паведамляе, што я бяру маршрут у правільным напрамку: „St. Berezowo". Заглядаю ў атрыманы ў аўтобусе білет, а там таксама пацвярджэнне, што я правільна вылез з аўтобуса: „STARY BEREZÓW"!..

Наш Сейм каханенькі, нашы такія ж міністэрствы ўзяліся пільна за вяртанне гістарычных назваў мясцовасцей, валюнтарыстычна замененых рознамаштабнымі чынамі. Але Сейм і міністэрствы ў Варшаве, а Старое Беразова ад Варшавы ой як далёка! Паветкі на аўтобусных нашых прыпынках у кожнай гміне выглядаюць інакш і мне па гэтым заключаецца, што тыя паветкі і падлягаюць гмінным уладам. Старое Беразова мае гонар быць у Гайнаўскай гміне, дзе войтам „наша" OLGA і — так мне здаецца — большасць чынавенства таксама мясцовага, „тутэйшага" хову. Яно перасялілася з вёсак у гарады, дзе Васі сталі Вацкамі, а Веры Весямі. Чаму ж бы і вёскі цэлай не перахрысціць на такі сам лад? Адносіцца гэта і да чынавенства былога дзяржаўнага бельскага Пэкаэсу, які цяпер стаў прыватным і прыняў імя Veolia, на якога аўтобусе я ў Беразова прыехаў, бо ж там заносяцца назвы мясцовасцей у бартавыя аўтобусныя касы. Сейм сеймам, а „парадак" на чыноўніцкіх вотчынах мусіць быць — так бы можна парафразваваць выказванне адной з гераінь славутага крэсанасмешлівага фільма „Sami swoi"; а мы ж, тут, таксама „свае"... Бо чаго тут тая Варшава хоча: укацапіць нас, мужыкоў з нас зрабіць, калі мы ў паны рвемся?!.

У пачатку вёскі крыж з кірылічным малітоўным надпісам на пастаменце, які просіць захіліць вёску ад трусаў і іншапляменцаў. Справядлівае „pobożne życzenie", бо ж той аўтобусны прыпынак і сведчыць пра націск іншапляменнасці на вёску і адсутнасць адважных супрацьставіцца гэтаму.

Крыху далей, некалькі дзесяткаў метраў ад вуліцы, плоскае рукатворнае ўзвышша з хрысціянскімі і дахрысціянскімі намагільнымі сімваламі. Згуртаваныя ў загародцы бетонныя, жалезны і драўляны крыжы прысвечаны ахвярам апошняй вайны, пра якія, як мне здаецца, пяром нашага Грышы Мароза ўспамінала Ніна Панасюк у нашай кнізе „Пакаленне вайны". На другім канцы ўзвышша тры колатыя валуны, якія калісь стаўлялі на магілах нашы язычніцкія продкі. Пасярэдзіне ўзвышша два высокія драўляныя крыжы.

Гэтае ўзвышша падалося мне цэрквішчам і гэтай здагадкай падзяліўся я з мужчынам, што сядзеў на лаўцы перад суседнім панадворкам. Аднак ён мне растлумачыў, што ў Старым Беразове царквы не было, але на тым месцы калісь хавалі памерлых ад мору людзей. Пра царкву ў Старым Беразове не згадвае і сужонства Рыгор і Антаніна Сосны ў сваёй кнізе „Zapomniane dziedzictwo", аднак на даведніку ў Карыцісках, выкананым Звязам беларускай моладзі, віднее інфармацыя, што ў Старым Беразове царква калісь усё ж была; цалкам верагодна, што на пазначаным цяпер крыжамі месцы...

З другога боку вуліцы спортпляцоўка, па якой можна ганяць мяч уздоўж і ўпоперак — так там расстаўлены вароты. Аднак тыя вароты выконваюць хіба толькі адзобную ролю, бо паміж імі ляжалі пакосы акуратненька скошанай буйной травы.

У месцы, дзе ад вуліцы выходзіць дарога ў поле, што ў напрамку Гайнаўкі, стаіць групка драўляных і каменных крыжоў. Надпіс на адным з іх паведамляе, што пастаўлены ён „парнями и девицами о здравіи и спасеніи воиновъ братиевъ нашихъ"; дату ўзвядзення гэтага помніка ўдалося мне прачытаць адно ў такой меры, што магу адно дадумвацца пра воінаў „на сопках Маньчжурыі" з 1904 года. Дарэчы, падобных крыжоў па старабераэоўскай вуліцы больш, а на найстарэйшых з іх, каменных з пачатку мінулага стагоддзя, паўтораныя выразнай фарбай высечаныя на іх надпісы.

Мураваны будынак вясковай святліцы ўдалося ў Старым Беразове паставіць яшчэ пры Ярузельскім, — так мне адказаў мой інфарматар на маю здагадку, што там раней была школа. А школы ў Старым Беразове не было, мясцовыя дзеці вучыліся ў Махнатым.

Чыгуначныя пуці з Гайнаўкі ў Бельск зараслі ўжо пустазеллем. Трымаецца яшчэ табліца з назвай станцыі, але тую назву можна цяпер прачытаць толькі хіба з дапамогай крыміналістычнай тэхнікі. Аднак добра помню яе: „STARE BEREZOWO" было...

У Старым Беразове большасць хат мураваная, драўляных мала. Але за чыгуначнай лініяй, у бок Махнатага, стаяць толькі мураваныя палацы. Добра гэта сведчыць пра заможнасць, пра гаспадарнасць старабераэоўскіх гаспадароў.

Махнатае таксама выглядае прыстойна. Нельга сказаць, што тут усе ў палацах жывуць, бо так нідзе няма, але бяднейшых хат тут амаль не відаць. Да гэтых апошніх можна залічыць школьны будынак, але толькі з прычыны яго самоты.

Пункт прыёму малака ў Махнатым наводзіць этымалагічныя асацыяцыі. Хаця ён яшчэ прымае сыравіну ад некаторых вяскоўцаў, аднак яго дах аздоблены не абы якой расліннасцю. Найчасцей найперш паяўляецца там мох, ад якога, як мяркую, выводзіцца і назва Махнатага, якое, да таго ж, распалажана ў неглыбокай лагчынцы, дзе каменям асабліва лёгка абрастаць гэтай бескараністай і бяскветачнай раслінай. Вершаць жа будынак малочнай станцыі бярозкі, ад амшэлых продкаў якіх узяліся назвы суседніх „старога" і „новага" сёл.

У канцы Махнатага з боку Старога Корніна ўражваюць металічныя, кожны з іх іншага дызайну, каваныя крыжыкі на драўляны стэлах; адна з іх з 15 чэрвеня 1861 года з выдатна захаваным надпісам лацінкай; магчыма, што гэта памятка настальгіі па ўніяцтве...

У Старым Корніне прыхадское свята Ганны, вялікі там „одпуст". Вёска ў гэты дзень выглядае як Варшава, уся вуліца з'яўляецца вялікай стаянкай легкавушак. І ларкоў вуліца поўная з імпартным кітайскім таварам, які хіба і ў Варшаве складана купіць. А калі ёсць нешта звычайнейшае, то цэны яго „варшаўскія"; напрыклад карціналомка (пазлы), якая ў Беластоку каштуе дваццаць злотаў, у карнянскай „варшаве" цэніцца ўжо ў трыццаць чатыры! І абедзве мясцовыя крамы, быццам гіпермаркеты, працуюць поўным ходам. А ў царкве сам мітрапаліт Сава правіць. І на вуліцы поўна народу па-варшаўску апранутага. На абведзенай ссечанымі бярозкамі асфальтавай пляцоўцы побач пажарнага дэпо людзі яшчэ рыхтуюць мясцовае nightlife — забаву; сцэнай для аркестра будзе трактарны прычэп. Каб было стопрацэнтна па-варшаўску, не хапала ў Старым Корніне дзвюх, у наш час вельмі важных дэталей — не было ніводнага банкавоза з банкаматам і не было ніводнага мабільнага крэдытнага офіса. Поўна ж у нас розных фінансісцкіх і менеджарскіх школ, якія выпускаюць сотні і тысячы праваднікоў па фінансавых лясах, а яшчэ ніхто з іх не прыдумаў пагнацца з гэтымі відамі паслуг насельніцтву на людны прыхадскі фэст...

На высокім драўляным крыжы, што стаіць на абочыне ляска між Старым Корнінам і Карыцісками, удалося мне прачытаць дзве даты: 1857 і 1912, але суседняга зместу, які б асэнсоўваў іх — не ўдалося.

Перад Карыцісками дзве драўляныя агароджы. У адной з іх магіла карыціскага селяніна, якога ў 1944 годзе забілі немцы, бо не хацеў ім аддаць свайго каня. Паколькі з-за разгару баёў немагчыма было завезці пакойніка на могілкі, астаўся ён побач сваёй вёскі. У другой агароджы старыя вербы і груша-дзічка ды два высокія драўляныя крыжы і адзін пусты драўляны кіот на таксама драўлянай аснове; магчыма, што і гэта памятка колішняга тут канфесійнага парадку. І ў пачатку Карыціск чатыры крыжы: адзін з іх высачэзны драўляны, тры меншыя цэментныя — з іх адзін, з характэрнай зоркай, пастаўлены савецкаму салдату, які загінуў побач вёскі.

Насупраць будынка святліцы і пажарнага дэпо прысядаю да двух мужчын. Калі даведаліся, што я з „Нівы", паскардзіліся на свайго дубіцкага войта. Бо калі пайшоў лівень і вада заліла мясцовыя сенажаці, адзін з іх пазваніў войту за дапамогай, бо на Падкарпацці, як пайшла вада, войт сарваўся сярод ночы і пагнаўся памагаць людзям. А наш войт стаў адмаўляцца: „Ja nie od wody, ja nie od wody". То ад чаго ж ты войтам, як не ад вады? Ты ж гаспадар цэлай гміны! — не здаваўся селянін. І на другі дзень ужо з самай раніцы на сенажаць з'явіліся прысланыя войтам рабочыя. Але з таго часу войт глядзець на прасіцеля не можа, дастае „шалу". Аднекваецца ён, аднекваецца ад спраў насельнікаў, але калі яго прыдушыць, то задзейнічае апаратыўна. Іншым разам мой суразмоўца, наведваючы гмінную ўправу, паведаміў, што ў Карыцісках перапоўнены сметнік і калі ён вярнуўся з гміны, той сметнік ужо апаражнялі гмінныя рабочыя.

Крыжы ў пачатку Карыціск

У час нашай размовы пад пункт прыёму малака прыехала цыстэрна. У некалькіх гаспадароў ёсць уласныя студзільнікі малака, некаторыя сяляне з Карыціск ды Істока здаюць тут сваё малако ў агульны танк.

У турдаведніках і на картах падаецца інфармацыя, што ў Карыцісках стаіць вятрак. Гэта праўда, толькі яго не відаць, бо стаіць ён за гаспадарчымі будынкамі і няма ў яго, пакуль, крылаў. І звонку яго нельга пабачыць, бо ў Карыцісках няма загуменных дарог. Трэба ісці да самога гаспадара...

Пісаў я ў пачатку, што ў Старым Беразове многа мураваных хат, але чым бліжэй пушчы, іх становіцца ўсё менш, а больш драўляных; у Старым Корніне і ў Карыцісках іх даволі многа. Магчыма, што не толькі блізкасць лясного матэрыялу спрыяла гэтай адрозненасці, магла на гэта паўплываць і якасць зямлі, якой у Дубіцкай гміне шмат апынулася пад лесам.

Згаданы ўжо даведнік у Карыцісках паведамляе, што назва вёскі выводзіцца ад рэчышчаў дзвюх рэк, што агібаюць вёску: на тапаграфічнай карце адна з іх названа Орляй, другая — Арлянкай; першая з іх *ісцякае* ў бок Карыціск ад *Істока*. Гэта адно, бо слова „карыта" абазначае таксама выдзеўбаную ў — часта вярбовым — бервяне пасудзіну для захоўвання вады, ці — як падае ў сваім этымалагічным слоўніку Аляксандр Брукнер — агульна аброку, спажывы жывёле. Паколькі вакол Карыціск шмат балот, у якіх водзіцца той матэрыял для карыт — вярба, дык магчыма, што мясцовыя майстры скарыстоўвалі яе для іх вырабу і для суседніх мясцовасцей, дзе такога матэрыялу было менш; ад гэтага занятку таксама магла пайсці назва вёскі.

## Грэбля Шумарскага

На тэрыторыі Белавежскай пушчы знаходзіцца шмат урочышчаў, якія свае назвы выводзяць ад канкрэтных людзей, у нейкі спосаб звязаных з дадзеным месцам. Наогул гэтых людзей здаўна ўжо няма ў жывых, але памяць пра іх усё-такі захоўваецца ў назвах. Адным з такіх менавіта ўрочышчаў з'яўляецца Грэбля Шумарскага.

Грэбля знаходзіцца ў Белавежскім нацыянальным парку, у аддзеле 254 D. Яна старая, магчыма, што была выканана яшчэ ў каралеўскі перыяд. Назву грэблі прысвоілі ў пасляваенны перыяд самі працаўнікі парку, у сувязі з тым, што яна вяла да патайнога месца вядомага ў дваццатыя гады мінулага стагоддзя браканьера, рабаўніка і забойцы Аляксандра Байко (1890-1943), які меў клічку Шумарскі. Пад гэтай клічкай быў ён і паўсюдна вядомы. Прэса дваццатых гадоў называла Шумарскага найчасцей „Каралём белавежскіх бандытаў" або „Гразой Белавежскай пушчы".

Шумарскі ў 1922 годзе забіў Іёселя Памеранца — багатага купца з вёскі Моталь. Абвінавачваўся таксама ў забойстве купца Торбачкі з Шарашова і яго рабочага Міхала Кшыўды. У 1923 годзе застрэліў генерала Юзэфа Булак-Балаховіча, у наступным годзе мясцовых мяснікоў — бацьку і сына, Пятра і Якуба Назарэвічаў. У 1925 годзе пазбавіў жыцця пастарункавага Пятра Падбельскага і, на канец, у 1926 годзе забіў мясніка Кароля Ляша. Як браканьер, на свой рахунак запісаў 500 дзікоў, 200 аленяў, 3 даніэлі і мноства драбнейшай дзічыны, якой ліку і сам не ведаў.

Па сённяшні дзень збераглися сляды патайнога месца Шумарскага, уладжанага на невялікім узвышшы пасярод дрэў. Выразна відаць яшчэ заглыбленне ў зямлі з-пад зямлянкі, побач якога расце старая, спарахнелая ў сярэдзіне ліпа, якой Шумарскі карыстаўся як сваім патаемнікам. Побач грэблі (каля 100 метраў ад зямлянкі) Шумарскі выканаў калодзежык, абкладзены фашынай, з якога набіраў сабе ваду для піцця. Калодзежык гэты не збярогся.

**Пётр БАЙКО**

## Дарога ў Бялках

Вёска Бялкі ляжыць у Нарваўскай гміне. Даўжынёй яна ў 900 метраў. Жывуць тут пераважна пенсіянеры. Праз нашу вёску праходзіць павятовая дарога, якая ад Трасцянкі да Бялкоў асфальтаваная. У самой вёсцы вуліца з'яўляецца хіба найгоршай ва ўсім Гайнаўскім павеце! На пачатку вёскі ў ёй ямы і выбоіны такія, што калі пойдзе дождж і шафёр-каскадзёр не прыпыніцца, дык вада ляціць вышэй акон! У другім месцы, каля будынка былой малачарні, штогод рамантуюць вуліцу, навозячы жвір. І там утвараюцца такія калдобіны, што легкавушку можна паламаць. На абочыне стаіць сухі вяз, і калі ён зваліцца, дык можа нарабіць шмат бяды, бо парве электралінію. І бяда гатовая!

Здаецца, павятовыя дарожныя ўлады на чале са старостам Гайнаўскага павета мала клапоцяцца пра вуліцу ў Бялках. Нашу вуліцу неабходна паладзіць!

**Мікалай ЛУК'ЯНЮК**

# Адкрываем Падляшша

**Агратурызм у Польшчы — з'ява новая. Пачаў ён развівацца некалькі гадоў таму, але вельмі хутка прыцягнуў увагу гарадскіх турыстаў і зараз многія гараджане выязджаюць у вёскі, каб адпачыць. У аграгаспадаркі Падляшша прыязджаюць людзі з усяе Польшчы. Мне пашанцавала пазнаёміцца з Монікай і Багданам — турыстамі з Тарнава, якія завіталі ў Рыбакі. Вось успамін Монікі з вандроўкі па ўсходняй Беласточчыне:**

Моніка і Багдан — турысты з Тарнава завіталі ў Рыбакі

— Наша веласіпеднае падарожжа па Падляшшы пачалося з чыгуначнай станцыі Сямятычы. Там мы пасля 10 гадзін язды поездам выгрузіліся з роварамі, торбамі і палаткай. Будынак вакзала — адзінокі, занядбаны. Прышпільваем торбы да роваў, марым аб гарбаце ці каве, бо інакш цяжка будзе нам ехаць. Адзінай душой на вакзале аказалася загадчыца станцыі. „Ці можна дзе-небудзь напіцца гарбаты?" — пытаем. „Уваходзьце, я вам прыгатую", — сказала. Пачаставала яна нас не толькі гарбатай, але і ўсходняй пальшчызнай, характэрнай сардэчным і гасцінным жыхарам „Усходняй сцяны". За парадай загадчыцы станцыі падаемся ў недалёкую вёску Гамоты. У ёй праводзім тры дні ў агратурыстычнай гаспадарцы. За гэты час на роварах наведваем прыбужскія ваколіцы. Затым падаемся на Грабарку — праваслаўны санктуарый. Шпацыруем сярод лесу крыжоў. Чытаем надпісы на іх. Старэйшыя — абымшэлыя, са спарахнелымі і апалымі перакладзінамі, зусім новыя — блішчаць свежасцю драўніны і залатымі таблічкамі з надпісамі на польскай і рускай мовах. Прысутнічаем у багаслужбе, каб паслухаць спеў манашак.

У Драгічыне нашу ўвагу прыцягвае чысціня і дагледжанасць мястэчка. Вядзецца рамонт кляштарных будынкаў, што можа прыцягнуць большую колькасць турыстаў. Далейшы шлях нашай веласіпеднай вандроўкі вядзе цераз Кляшчэлі і Дубічы-Царкоўныя. Па дарозе мінаем абязлюджаныя, забытыя вёскі. Час ад часу сустракаем нейкі стары млын схаваны ў пустазеллі. Каля яго ляніва цячэ вада, а аб млынавым коле напамінаюць адно збуцвелыя ашчэпкі. На брукаванай дарозе на ровары ехаць цяжка, але і ў гэтым ёсць свайго роду чароўнасць. Мінаем апусцелыя дамы, відаць, маладыя не хочуць заставацца на вёсцы. Заўважаем некашаныя сенажаці. Дубічы-Царкоўныя — у вёсцы многа старых драўляных дамоў, акружаных чароўнымі агародчыкамі, з калодзежамі на панадворках. Сярод іх высяцца новыя дагледжаныя дамы з акуратна падстрыжанай травой навокал. Кантраст традыцыйнай забудовы з сучаснай будзе нам спадарожнічаць у многіх мясцовасцях Падляшша.

Далейшы наш маршрут пралягаў праз Белавежскую пушчу. Навокал цішыня, трывожаная шумам дрэў і спевам птушак. Мінуўшы Тапіла, хвілінку адпачываем над возерам. У гэты дзень не працавала вузкакалейка і таму не было людзей. Некалькі гадоў таму былі мы ў Будах, Тэрэсках, Пагарэльцах. Бачым як многа змянілася за гэты час. Многія агратурыстычныя гаспадаркі прапануюць турыстым начлегі і іншыя паслугі. Памалу знікае ранейшы выгляд вёсак. У Белавежы гатэль большы за саму мясцовасць. Поўным ходам вядуцца дарожныя работы, смурод расплаўленага асфальту забівае водар пушчы. Пушчанскі рэгіён славіцца сваімі прыроднымі каштоўнасцямі, таму, каб прыцягнуць турыстаў, трэба ім гарантаваць поўны камфорт. Але трэба памятаць, каб пры гэтым не знішчыць астаткаў першабытнай пушчы.

Сваю вандроўку працягваем далінаю Нараўкі — Падляшскім буслінымшляхам. Фактычна, буслоў бачым часта, відаць, што тут добрыя для іх умовы. У вёсцы Рыбакі Міхалоўскай гміны, над Семяноўскім вадасховішчам сустракаем Аляксандра Хлябіча, які дазволіў нам паставіць палатку ў сваім агародзе. Гаспадар і ягоная жонка Марыя павялі нас на прагулку па ваколіцы, расказалі пра мінулае. З плаціны праз бінокль бачым астравок. У час вайны гэта была горка, за якой вяскоўцы хаваліся ад надыходзячага фронту. Пасля не толькі горка, але і ўся вёска апынулася пад вадой. Спадарства Хлябічы расказалі, як безагаворачна высялілі сялян у блёкі, якія да сённяшняга дня страшаць сваім выглядам. Турысты над Семяноўскім вадасховішчам бачаць толькі гладкую паверхню вады, прыдатную для плавання, купання, рыбалкі, але мясцовае насельніцтва памятае аб крыўдзе, сумуе па сваім родным.

Цікавасць новых, нязнаных мясцовасцей вядзе нас у Супрасль. Знаёмімся з мястэчкам, яго брукаванымі вулачкамі. Хаця нявыгодна ехаць па бруку на ровары, але няхай так застанецца. Не залівайце брукаванак асфальтам! Наведваем палац Бухольцаў і манастырскі ансамбль. У Дабравешчанскай царкве прысутнічаем у багаслужбе. Шкада, што храм — усяго рэпліка. Непаўторная, касмічная гармонія галасоў царкоўнага хору і званоў пакінула ў нас незабыўнае ўражанне. Папраўдзе, галоўнай нашай мэтай у Супраслі быў Музей ікон — адметны ад усіх музеяў, якія мы бачылі. У ім ікона не толькі музейны экспанат, але і сакральная каштоўнасць. Праваднік у сваім расказе ўвесь час звяртае ўвагу на сакрум іконы і яе сімволіку.

З Супраслі падаемся ў бок Крынак. Па дарозе наведваем арбарэтум у Копнай Гары і сільварый у Пачапку. Крынкі — мястэчка з цікавай прасторавай планіроўкай. Марнее яўрэйская бажніца — дзверы і вокны забітыя бляхай, некаторыя аконныя праёмы замураваныя, цэглы трухлеюць. Спыняемся ў недалёкіх Лапічах. Мала такіх спакойных месц як тут. Вечарамі і ранкамі сябрамі нам з'яўляюцца спеў птушак, кваканне жаб, шум дрэў. Вандруем па вёсках ля самай дзяржаўнай граніцы. Драўляныя хаты, брукаваныя вуліцы — быццам час затрымаўся сто гадоў таму. Пры плоце сядзіць старая кабета. Час ад часу б'е пластмасавай бутэлькай з-пад мінералкі па штыкетах. Падыходзім да яе, заводзім размову. Аказалася, што такім чынам адпалохвае яна шпакоў ад вішань.

Прыдарожныя драўляныя крыжы з цягам часу парахнеюць, ніхто не ставіць новых. Такіх краявідаў як у Азяранах, Ласінянах, Рудаках мы не сустракалі нідзе. Таксама і там у традыцыйным антуражы вырастаюць сучасныя дамы, кантрастуючы з беднымі хаткамі.

Татарскі шлях — Крушыняны, Багонікі. Дакранаемся да гісторыі — веды з падручнікаў становяцца рэальнымі, жывымі. Гэта добра, што існуе на свеце месца, дзе ў згодзе і пашане жывуць побач сябе людзі розных нацый і канфесій. Добра, што польскія татары дбаюць пра сваю тоеснасць, рэлігію, культуру, стараюцца паказваць яе турыстам. Можа ў гэтым і замнога камерцыі, так як і ў Белавежы, але, відаць, інакш нельга. У Малявічах калісь таксама жылі татары. Сёння толькі валун з высечаным надпісам напамінае аб іх бытнасці.

Сваё падарожжа кончым у Аўгустове. Балючае вяртанне ў цывілізацыю. І зноў шматгадзіннае падарожжа назад, цягнікам. Будзе аб чым расказваць сям'і і знаёмым.

Мы абое — музыканты. Апрача музыкі цікавіць нас прырода, культура і ўсё адметнае ад штодзённасці. Мэта нашых веласіпедных вандровак — пераадольванне доўгіх маршрутаў. Часам едзем на роварах даўжэй, часам карацей, спыняемся там, дзе можна пабачыць нешта новае. Ужо дзевяць гадоў запар на два тыдні адкладваем свае інструменты і на роварах падаемся на ўсход Польшчы. Пабывалі мы на Расточы, Лэнчыцка-Владаўскім паазер'і, Падляшшы, над Бобраю. Усюды сустракаліся мы з сардэчнасцю і гасцінасцю мясцовага насельніцтва. Здаралася, што прымалі нас зусім бескарысліва. Дзякуем ім усім, а асабліва спадарству Рэмешам з Гамотаў, спадарыні Шыманюк з Грабаўца, спадарству Войцюкам з Чарлёнкі, Марыі і Аляксандру Хлябічам з Рыбакоў, спадарыні Ляхман з Супраслі, спадарству Маршалкам з Лапічаў, Гражыне Занеўскай з Малявіч-Гурных.

**Запісаў Віктар БУРА**

# Фестывальная разнароднасць

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

**Летам у Гайнаўцы і наваколлі арганізуецца многа культурных мерапрыемстваў з беларускімі песнямі ў выкананні мясцовых калектываў, гасцей з іншых рэгіёнаў Беласточчыны і Рэспублікі Беларусь. Ладзяцца шматлікія фестывалі, канцэрты і фэсты, так што журналістам з беларускіх масмедыяў цяжка пабываць на ўсіх імпрэзах, каб прадставіць іх чытачам і слухачам. Лік беларускіх мерапрыемстваў заўважальна большае ў час запустаў і выдатна меншае ў летнія пасты. Хаця ладзяцца тады польскія імпрэзы, зацікаўленне імі наогул меншае. Большае прызнанне ў масавай публікі здабываюць шматкультурныя мерапрыемствы. Вялікую фальклорную разнароднасць можна было ўбачыць у Гайнаўцы ў час „Падляшскай актавы культур" і на Міжнародным фестывалі фальклору „Падляшскія сустрэчы", які ладзіцца ў меншых мясцовасцях Падляшша. На чацвёртым выпуску гэтага мерапрыемства з фальклорам усходняй, заходняй і паўднёвай Еўропы ды Грузіі мела нагоду пазнаёміцца ў масавым маштабе публіка ў Бельску-Падляшскім (20 і 21 жніўня) і Гайнаўцы (22 жніўня).**

*„Маланка" запрэзентавала свой навейшы рэпертуар*

Выступы ў Гайнаўцы пачаліся з карагода з-пад Гайнаўскага дома культуры ў амфітэатр. Калектывы коратка затрымліваліся па дарозе, каб паказаць народныя песні і танцы. Гайнавяне астанаўліваліся і з захапленнем успрымалі танцораў і спевакоў. Была гэта хіба самая лепшая рэклама мерапрыемства, якое ад трох гадоў зжываецца з прыпушчанскім горадам і прыцягвае ў амфітэатр шмат публікі.

— Вялікая разнароднасць на нашым фестывалі. Публіка мае нагоду пазнаёміцца з песнямі і танцамі народаў Еўропы і Азіі. У гэтым годзе прыехалі грузіны, раней быў калектыў з Турцыі, — кажа дырэктар фестывалю Міраслаў Шыманскі. — Ідэя нашага мерапрыемства — пазнаёміць публіку з рознымі культурамі Падляшша, іншых рэгіёнаў Польшчы, свету і прыблізіць нашу падляшскую разнароднасць гасцям з іншых рэгіёнаў. Удзельнікі калектываў маюць магчымасць спаткацца, паразмаўляць з сабой і абмяняцца вопытам. Наш фестываль вельмі хутка разрос-ся. Распачыналі мы з Браньска, а зараз выступаем у многіх мясцовасцях. Дамы культуры з'яўляюцца суарганізатарамі нашага мерапрыемства, а мясцовыя самаўрады і прадпрыемствы — галоўнымі нашымі спонсарамі.

Пад бурныя апладысменты сыходзіла са сцэны бельская „Маланка". Спевакі мелі права быць крыху стомленымі, бо выступалі ў паасобных мясцовасцях, што былі на фестывальнай дарозе, але гэтага не было па іх відаць.

— Я нават не разлічваў, што так многа людзей збярэцца ў Бельску. Былі запоўнены сядзячыя месцы. Паліцыя налічыла пад 700 асоб у амфітэатры. Калі б канцэрт ладзіўся ў сонечную нядзелю, было б напэўна далёка за тысячу чалавек. Мы выступілі з навейшым рэпертуарам, з нядаўна апрацаванымі песнямі, — сказаў дырэктар Бельскага дома культуры і заадно кіраўнік „Маланкі" Сяргей Лукашук.

Спевакі з Бельска былі рады выступам, але шкадавалі, што не маюць магчымасці дагаварыцца з калектывамі з заходняй і паўднёвай Еўропы. Аднак была магчымасць паразмаўляць з выканаўцамі з Польшчы і Расіі. Меў прыехаць таксама калектыў з Рэспублікі Беларусь, канкрэтна з Пружан.

— Мы прынамсі на некалькі тыдняў да фестывалю павінны ведаць, якія калектывы да нас даедуць, — заявіў дырэктар Міраслаў Шыманскі, які шкадуе, што не выступіў калектыў з-за ўсходняй мяжы.

— „Падляшскія сустрэчы" гэта, побач „Падляшскай актавы культур", фестываль, у час якога публіка мае самыя вылікія магчымасці пазнаёміцца з разнароднымі культурамі свету. Мы вельмі рады, што можам удзельнічаць у гэтым мерапрыемстве з другога выпуску, бо першы, у Браньску, меў мясцовы характар, — сказаў дырэктар Гайнаўскага дома культуры Андрэй Скепка.

## *Дынаміка перапляталася са спакоем*

Не толькі маладую публіку моцна захапіў дзіцяча-маладзёжны калектыў „Lashkuruli" з Грузіі. Акрабатыка хлопцаў, якія скакалі ў час танцаў з неверагоднай лоўкасцю, кідалі ўверх мячамі, як мячыкамі, і танцы дзяўчат на пальцах з небывалай лёгкасцю зрабілі выступ маладых грузінаў вельмі займальным. Паспрабаваў я паразмаўляць з маладымі грузінскімі танцорамі па-расійску, але яны не разумелі расійскіх слоў. Аднак хутка паклікалі хлопца, які ў дзяцінстве пражываў у Расійскай Федэрацыі.

— Вельмі падабаецца нам на вашым фестывалі. Мы выступалі ўжо ў Францыі, Германіі, але тут таксама асаблівы клімат, — заявіў малады суразмоўца. Аказваецца, што каб дайсці да такога акрабатычнага майстэрства, трэба доўга трэніравацца. Апошнім часам займаюцца яны калектыўна амаль кожны працоўны дзень у тыдні і прытым доўга. Трэба таксама трэніравацца індывідуальна, каб мець гібкасць і вялікую ўстойлівасць.

— Я адчувала, што сцэна ў амфітэатры ажно дрыжыць ад гучнай музыкі грузінаў. Выступы дзетак рабілі вялікае ўражанне на ўсіх сабраных. Я бачыла, што людзі пры сцэне крыху адыходзілі назад, апасаючыся, што падкінуты ўгору меч можа на іх упасці або са сцэны можа зляцець малады танцор, — сказала асоба з публікі.

Надзвычай спакойнымі былі старэйшыя выканаўцы з калектыву „Triglav" са Славеніі. Паказалі яны частку народных славянскіх традыцый, якія і на поўдні Еўропы не мусяць быць перапоўнены эмоцыямі. Затое вельмі дынамічным, з меладычнымі песнямі і хуткімі танцамі, быў выступ расійскага калектыву „Забава" з Саратава. Польскую культуру прэзентавалі ажно тры калектывы „Скаўронкі" з Браньска, „Падляшша" з Шэпятова і „Люсавяцы" з Люсова каля Познані.

Хаця былі гэта прадстаўнікі заходніх славян, іх выступы былі больш падобнымі да спеваў і танцаў усходніх сабратаў. На палякаў з Падляшша якраз вялікае ўздзеянне мае ўсходняя культура, хаця б наша, беларуская. „Pallieterke" з Бельгіі і „Hellendoorn" з Галандыі былі цікавымі для гайнаўскай публікі якраз з-за іх культурнай адметнасці. Апрача Гайнаўкі і Бельска-Падляшскага суарганізатарамі фестывалю, што адбываўся з 18 па 24 жніўня, былі перад усім Браньск, ад якога ўсё пачалося, Цехановец, Шэпятова і Сураж.

## *15 гадоў з „Перапёлкай"*

У пачатку канцэрта і ў завяршальнай яго частцы з беларускімі народнымі танцамі выступілі маладыя танцоры гайнаўскага Калектыву народнага танца „Перапёлка". Якраз у гэтым годзе святкавалі яны 15-годдзе і таму арганізатары мерапрыемства заявілі, што выступы на гайнаўскім канцэрце адрасуюцца растанцаванай моладзі з Гайнаўкі.

— Апошнім часам мы найчасцей выступалі з беларускімі народнымі танцамі, але ў нашым рэпертуары ёсць таксама польскія і ўкраінскія. Сёння ў нас багаты рэпертуар: „Весялуха", „Мітусь", „Полька беларуская", „Крутуха"..., — пералічвала Юстына Каліноўская, маладая, але вопытная загадчыца танцавальнага калектыву. — Удзел у гэтым фальклорным фестывалі гэта для нас вялікі вопыт. Маем магчымасць паглядзець на іншых танцораў, на іх рэпетыцыі і вучыцца новаму ад іх. Размовы паміж кіраўнікамі калектываў і танцорамі таксама адукацыйныя.

Цяпер у калектыве „Перапёлка" займаецца каля 60 дзетак і моладзі з падставовых, гімназічных і звышгімназічных школ, у трох групах, залежна ад узросту. За звыш 15 гадоў дзейнасці калектыву (заснаваўла яго інструктар ГДК Анна Баран) прайшло праз яго больш за 200 чалавек. Калектыў даў ужо звыш 400 канцэртаў і звыш 20 разоў пабываў з гастролямі за мяжой, у Беларусі, Расіі, Латвіі, Эстоніі, Швецыі і Італіі. Калектыў прымаў удзел у шматлікіх конкурсных аглядах і вяртаўся з узнагародамі. У час „Падляшскіх сустрэч" калектыў „Перапёлка" захапляў публіку беларускімі танцамі. Гайнаўская публіка прыйшла на мерапрыемства, каб паглядзець на выступы сваіх дзетак і ўнукаў, якія з народнымі танцамі вяртаюцца ў мінулае Гайнаўшчыны.

# Поп сваё, чорт сваё

Аб тым, колькі я нагаварыўся з людзьмі аб шкоднасці „лячэння" ў розных шаптух, знахараў і біяэнергатэрапеўтаў, найлепш ведаюць суседзі. І ў „Ніву" некалькі разоў я аб гэтым пісаў. І ўсё — што гарох аб сцяну!

Нядаўна да маёй суседкі прыехала ўнучка з мужам і дзяцьмі. Жывуць яны ў Бруселе, але ў водпуск прыязджаюць у Польшчу. Пагасцілі яны, парадавалі жанчыну сваёй маладосцю і жыццярадаснасцю — ды дамовіліся на супольную паездку ў Орлю, да Валечкі. Мая суседка ў такім ужо ўзросце, што ўвесь час штосьці новае пачынае ёй дакучаць, але малыя праўнучкі яшчэ нават у школу не ходзяць. Дык што з імі адбываецца, каб трэба было іх „лячыць"? Аказваецца, што адна дзяўчынка пакутуе ад кінетозу (хваробы руху), другая — час ад часу ноччу плача. Што ж, нават у маладых еўрапеек бываюць свае праблемы. Пры нагодзе паехала з імі яшчэ адна асоба — медсястра па прафесіі.

Так, шаптуха прыняла іх. Па чарзе накрывала ім галовы, шаптала над імі „малітвы", а на канец кожнаму дала „лякарства". Я не пытаў што атрымалі дзеці, але суседка, якая наракае на боль у плячы і на сухасць у роце, атрымала для спажыцця (а як жа ж, з малітвай) кавалак цудадзейнага хлеба і маленькі пакецік з некалькімі зярняткамі пшаніцы. Зярняты трэба было ёй выкінуць за сябе на ростанях, але „хворая" не адразу заўважыла іх і пасля ўзнікла праблема што з імі зрабіць, каб падзейнічалі. Будучы на Ілью ў царкве, выкінула іх на скрыжаванні дарог ля храма. Вядома, з малітвай на вуснах, бо ж увесь час маем дачыненне з хрысціянамі.

Пайшоў я адной раніцы да суседкі даведацца як яна сябе адчувае, ці боль суцішыўся. Плячо як балела, так і баліць, хаця трохі менш, аднак сухасць у роце засталася. „Пэўне таму, што не адразу вынікула тыя зярняткі, але я іх сапраўды не заўважыла", — патлумачыла мне з выразным сумам на твары. Сапраўды, хіба таму...

Задумваюся няраз над тым, якія каштоўнасці ўнеслі мы ў супольную Еўропу. А то рэгіянальныя стравы, а то пушчу і азёры. Але не забывайма пра найважнейшы ўклад: пра нашых падляшскіх шаптух! Калі іх слава даходзіць да сталіцы Бельгіі, то сур'ёзная справа! І нават патэнтаў купляць не трэба, бо ў іншых краінах такога багацця няма. Прынамсі да часу, пакуль пачнуць прымаць афрыканскія плямёны з іх шаманамі, можам спаць спакойна: нічога нам не пагражае!

**М. Ц.**

# Папраўка

У фельетоне Васіля Сакоўскага „Памылкі" („Ніва" № 34) канец перадапошняга абзаца павінен гучаць: „У Польшчы і ва ўсіх краінах, праз якія яны прайшлі, цяпер капіталізм працвітае. Нават на ўсёй тэрыторыі былога Савецкага Саюза прыжыўся капіталізм не горш славутага рускага мата. Значыць і на сацыялістычнай глебе зусім някепска радзіць сабе капіталізм...".

За дапушчаныя памылкі просім прабачэння ў Аўтара і чытачоў.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

# Чытайце кніжкі ў новым 2009/10 навучальным годзе!

Мяне прыемна здзівіла, калі амаль усе ўдзельнікі XXIII Сустрэч „Зоркі", на пачатку знаёмства адзначылі, што чытаюць кніжкі і спяваюць у... царкоўных харах.

На здаровы розум, такія словы не павінны здзіўляць. Але, на жаль, у наш час здзіўляюць. Дастаткова глянуць на літаратурныя конкурсы беларускай паэзіі і прозы. У мінулым годзе на конкурс не паступіла ні адна літаратурная праца ад школьнікаў і гімназістаў.

Чаму так дзеецца? У адказ чую адны і тыя ж словы:

— Ніхто цяпер не чытае, такі час!

Наш час, паводле многіх, значыць камп'ютар! Дакладней, камп'ютарныя гульні.

Такія тлумачэнні для мяне малацікавыя. З дапамогай камп'ютара можна наведаць інтэрнэт-бібліятэкі, у тым ліку і беларускія. І прачытаць амаль усё, што напісаў выбраны аўтар. І ўсё, што напісалі пра яго і яго творачасць іншыя... Бо тыя нараканні на камп'ютар чамусьці спалучаюцца з бяздзейнасцю. У школах перасталі арганізаваць аўтарскія сустрэчы. А калі нават здараюцца такія ПАДЗЕІ, яны нікога не цікавяць, не кранаюць. Доказ? Вучні не маюць патрэбы набываць кніжкі з аўтографам (хоць яна па сімвалічнай цане)... Час ад часу сустракаем і адваротныя прыклады. Там, як на далоні, відавочная праца настаўніка. Цікавая з'ява адбываецца ў Гарадку, дзе ладзяць літаратурныя сустрэчы для дзяцей з удзелам мясцовых сучасных аўтараў. Такія сустрэчы ўзбуджаюць цікавасць да

Фота Ганны Кандрацюк

Фота Тамаша Ляшкевіча

ўласнага панадворка. Вось, у тым жа Гарадку, добравядомы рок-гурт „РІМА" запісвае новы кампакт-дыск з песнямі на словы М. Арла, паэта пачатку XX стагоддзя, родам з іх мястэчка.

Нягледзячы на ўсе нашы нараканні, зацікаўленне кніжкай у свеце мае выключна важны характар. Мода на кніжку пашыраецца найперш праз настаўнікаў. У Канадзе, самай насычанай камп'ютарамі краіне свету, найлепшым падарункам для дзіцяці з'яўляецца... кніжка! Няма лепшага падарка на Каляды ці дзень нараджэння. Кніжка з аўтографам аўтара там — памятка на ўсё жыццё. Цацкі, вопратка і ўсякія ласункі (чытайце, нашы найлепшыя падарункі) у дастатнім ка-

працяг ☞7

# Старажытны горад Бельск (3)

Царква Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, найстарэйшы храм у Бельску, спачатку знаходзілася на тэрыторыі бельскага замка. У 1562 годзе была перанесена на сённяшнюю вуліцу Ягелонскую. Цяперашні будынак царквы ўзведзены быў у XVIII стагоддзі.

У Прачысценскай царкве знаходзіцца ікона Багародзіцы Адзігітрыі, якую царкве падаравала Алена — жонка караля Аляксандра Ягелончыка. Ікона славутая шматлікімі цудамі і аздараўленнямі. Па сённяшні дзень да бельскай іконы Божай Маці прыходзяць тыя, якім патрэбная дапамога ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Прыхадское свята ў Прачысценскай царкве лічыцца самым важным для праваслаўных жыхароў горада.

Каралева Алена — адна з найбольш знамянітых асоб, якія спрычыніліся да развіцця Бельска. Пасля смерці мужа Бельск быў дадзены ёй у пажыццёвае ўладанне. Якраз на перыяд уладання Бельскам каралевы Алены прыпадаюць гады буйнага развіцця горада. Якраз у часы яе ўладання Бельск пераўтварыўся ў адзін з важнейшых гаспадарчых і культурных цэнтраў Вялікага Княства Літоўскага. Улады Бельска, каб падкрэсліць вялікую ролю Аляксандра Ягелончыка і каралевы Алены, іхнімі імёнамі назвалі два гарадскія паркі.

З царквы Нараджэння Прасвятой Багародзіцы падаемся ў цэнтральнае месца горада, каб пабачыць сімвал Бельска — ратушу.

Цяперашні будынак ратушы праўдападобна стаіць на месцы спаленай драўлянай ратушы з XV стагоддзя. У 1776-1780 гадах паўстаў но-

вы будынак, які на працягу стагоддзяў быў некалькі разоў перабудоўваны.

У XIX стагоддзі ў будынку ратушы знаходзіліся павятовы суд ды некалькі крамаў. У пазнейшы час роля будынка мянялася. Знаходзіліся тут бібліятэка і гарадская ўправа.

У васьмідзесятыя гады XX стагоддзя, дзякуючы намаганням архітэктараў, удалося зрэканструяваць першапачатковы выгляд будынка, а ў 1984 годзе пачаў працаваць у ім музей, які існуе па сённяшні дзень.

У залах музея-ратушы ў Бельску працуюць выстаўкі, прысвечаныя гісторыі горада, яго славутым людзям, вынікам археалагічных даследаванняў на вуліцы Замкавай.

Бельск-Падляшскі — горад з багатай гісторыяй. Шмат чаго можна яшчэ ў ім пабачыць, між іншым, тры гістарычныя цэрквы, два старадаўнія касцёлы. Таму раю прыехаць у Бельск і пабачыць яго старажытнасці.

**Міхась СЦЕПАНЮК**

Міра ЛУКША

# Сыч з Сычоў

Сонны сычык сарамлівы
на світанні сеў на сліве.
І ўсё роўна, ці салата
яму бачна, ці саната —
сослепу сачыў за светам.
Ссіп. Уся песня спета
салаўёва ў Сычах.
Сонцалюбны цяпер птах
спеў свавольны па садках,
сенажацях распяе,
свіст-святло ўсім разашле.
Вось сабрацца б, пастагнаць,
бо як жа тут саступаць,
тым сапернікам-свістухам,
сведкам сонечных спадмухаў
смальнуць бы ў скронь каля вуха!
І усчуюць тыя словы
свойскай песні адмысловай:
саха, серп, салома, сена
і сярмяга, і спадмена,
седала, ствол, служба, стог...
З славаю да перамог!
Сасчапіцца б за сарочкі —
пёры паляцяць у садочку.
Слабакі ж! Сарамата!
І на соцна спадылба
сычык сослепу сіпеў:
Чую той варожы спеў
спераду і за спіною!
Селі на нас чарадою!
Досыць скардзіцца, стагнаць!..
Нам, сычам, усім спяваць!
Усчаць сваяцкі перасвіст!
Кожны сычык-актывіст,
незалежна ад пары,
звечара ці на зары
хай змагаецца бясконца
па сычоўскай усёй старонцы.

Фота Тамаша Ляшкевіча

6 ☞працяг надскім свеце не выклікаюць цікавасці. Вядома, такі погляд дзеці прымаюць ад дарослых: бацькоў і настаўнікаў...

— Аўтары ўсіх гэтых камп'ютарных гульняў не дазваляюць на іх глядзець сваім дзецям, — кажа маладая настаўніца інфарматыкі з Канады. — Іх дзеці ходзяць на традыцыйныя ўрокі музыкі, іграюць на скрыпцы ці піяніна, займаюцца ў гуртках зацікаўлення. І абавязкова чытаюць кніжкі. Чаму? Бо гэта найлепшы спосаб самаразвіцця дзіцяці...

Калі зірнула я ў інтэрнэт і пазнаёмілася з прапановамі нашых школ, мяне прыемна ўразіла бельская „тройка". Сярод гурткоў зацікаўлення ў іх між іншым сустракаем „Гурток любіцеляў кніжкі", „Круг сяброў бібліятэкі", „Гурток любіцеляў інтэрнэт-бібліятэкі"... Бельская „тройка" — адна з найлепшых школ на Падляшшы. Два гады назад гэтая школа з беларускай мовай навучання заняла першае месца ў прадметных конкурсах у ваяводстве. Імпазантныя таксама вынікі мінулага года. Сярод навучэнцаў пачатковай школы і гімназіі тут было 25 лаўрэатаў прадметных конкурсаў і пяць фіналістаў. Шкада адно, што не было сярод іх лаўрэатаў беларускіх літаратурных конкурсаў. Мастацкія здольнасці нашых школьнікаў ад заўсёды мяне захапляюць. Вось і сярод згаданых удзельнікаў XXIII Сустрэч „Зоркі" праявіліся паэты, празаікі, ілюстратары, здольныя фатографы. Цягам тыдня ўзніклі два апавяданні, верш, шмат актуальных фельетонаў. І, самае цікавае, згаданыя творы ўзніклі па прапанове самой моладзі. Тут проста спрацавала захапленне ад сустрэч з літаратарамі, людзьмі тэатра, настаўнікамі... І найважнейшае — любоў да кніжкі.

Дарэчы, самі пабачыце. Неўзабаве ва ўсе школы, у якіх выкладаецца беларуская мова, мы дашлем сустрачанскія газеты, з артыкуламі і творчасцю сучаснай моладзі.

**ЗОРКА**

## Міграцыя звяроў і эмоцыі

Лясныя звяры ўцяклі з Белавежскай пушчы. Да іх далучыліся птушкі і хатняя жывёла. Мы змаглі пачуць іх таямнічыя галасы. Яны цяпер жывуць у спадара Барыса Казлоўскага, уласніка агратурыстычнага пансіяната „Бора-Здруй" у Новым Ляўкове. Гэты пабег адбыўся тады, калі звяры прачнуліся з зімовага сну. Хоць гэтыя звяры зроблены з пластмасы і паперы, яны могуць напужаць! Бо месца, дзе яны пасяліліся, гаспадар чамусьці ахрысціў „месцам эмоцыі". Назвы, як вядома, самі гавораць за сябе. Хочаш ці не, трэба іх баяцца!

**„Аранжавая хатка",**
***Эля Коршак*** *(Белгімназія ў Бельску-Падляшскім)*

# Музыка з кайфам

**Шаноўнае Спадарства,**

**прадстаўляю: Ян Маўзэр!**

Цікавіць яго боль і каханне, музыка ды чытанне. Любіць таксама пісаць, але перш за ўсё спяваць і ствараць. Стварае вобраз самога сябе і сваёй музыкі, якую можам найпрасцей акрэсліць „Маўзэр"! Сёння прыблізімся да асобы Янкі Маўзэра, лідара гурту „Тав. Маўзэр", які сёння застаўся ўжо толькі „Маўзэрам", а так, праўду кажучы, каб не было Янкі, не было б і ніякіх „маўзэраў".

— Я вакаліст „Маўзэра". І гэта мая асноўная радасць. Часова беспрацоўны, часова цікавы, часова прыгожы. І наадварот, — піша пра сябе наш герой.

У 2005 годзе завершыў адукацыю на Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя Аркадзя Куляшова. Працаваў у „Беларусьбанку", але за ўдзел у пратэстах на Кастрычніцкай плошчы ў Менску ў сакавіку 2006 года быў вымушаны сысці з працы. Ужо тады быў даволі вядомым музыкам, бо папулярнасць прыйшла разам з перамогай у конкурсе на фестывалі „Басовішча-2005". У 2006 годзе ў гурту з'явіўся дэбютны альбом „Радасць". Янка таксама прызнаны быў за гэты год „Выканаўцам года" ў час „Рок-каранацыі" — адной з важнейшых музычных прэмій у беларускай музыцы.

Зразумела, ён у сапраўднасці не называецца Маўзэр, але, як падкрэслівае, не любіць свайго прозвішча ды яго не папулярызуе. У бацькоў за гэта жалю, відаць, няма, а і ягоная мама ў адным з інтэрв'ю кажа, што яна ганарыцца сынам, бо гэта „добры, разумны хлопец са сваім пунктам гледжання на ўсё і на ўсіх. Мяркую, што маё прызначэнне — не перашкаджаць, а памагчы, чым магу".

Янка прыцягнуў увагу слухачоў сваёй лірычнай і альтэрнатыўнай „Калыханкай", якая стала гітам. Зараз, што мне пацвердзіў Зміцер Вайцюшкевіч, будзе выступаць у святочным, дзіцячым праекце пад рабочай назвай „Анёлкі". Вакаліст не стаіць у месцы. У развіцці кар'еры дапамагае перш за ўсё сабе сам, цяжкай працай ды паслядоўнасцю. Любіць музыку і любіць сябе, як кажуць пра яго фанаты і сябры, але гэты эгацэнтрызм толькі дапамагае. Ведае сваю вартасць ды вартаснай лічыць сваю працу. Адлюстроўваюць гэта і словы крытыкі. Янку прызнаюць класным чалавекам як у кантэксце музыкі, так і беларускасці. А падумайце, што ён пачаў гаварыць на беларускай мове толькі ў час вучобы на ўніверсітэце! Зараз на ёй пачалі гаварыць яго сястра ды бацькі, якім гэта прыходзіць з цяжкасцю, але стараюцца і разумеюць, што гэта іхняя мова. Дзеці вучаць сваіх бацькоў. Часам і так бывае, часам так трэба.

**i_basovka@o2.pl**

## *Польска-беларуская крыжаванка № 36*

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 31:

Песні, марак, мак, звяз, світанак, ты, свята, урок, жалеза, раса, рыт, птах, львіца. Шах, Парыж, пік, слых, звяз, Віталь, мята, каза, Нурэц, панарама, какос, каша.



# Калевала — музычны міні-эпас

— Як успамінаеш ваш канцэрт на сёлетнім юбілейным, дваццатым фестывалі „Басовішча”?

— Гэта не быў найлепшы канцэрт, але будзем старацца, каб было лепш. Не хочам спыняцца.

І не спыняюцца. На пытанне пра юбілейнае „Басовішча”, Андрэй Паплаўскі, вакаліст гарадоцкага гурту „RIMA” сказаў мне, што калі арганізатары іх запросяць, то з ахвотай праз год на сваёй любімай сцэне ў Барыку зайграюць дзесяты, юбілейны канцэрт. Але юбілей гоніць юбілей. Сёлета такое вялікае музычнае мерапрыемства як „Прыпынак Вудсток” адзначыла свой пятнаццаты выпуск.

— Там вы таксама выступалі, — загаворваю з Андрэем.

— Мне здаецца, што і праз дваццаць гадоў добра будзе гучаць сказ „Мы выступалі на Вудстоку”.

— А помніш гэты канцэрт?

— Шчыра кажучы, не вельмі. Гэта былі такія вялікія эмоцыі. Мы тады іграли з сабою вельмі коратка і не ведалі ці справімся з так вялікай сцэнай. Гэта быў вялікі духовы вопыт і, заадно, выклік.

— Але ўдалося.

— Удалося, больш-менш удалося.

Заўсёды неяк бывае — або лепш, або горш, бо і фактараў, якія ўплываюць на музыкаў, таксама многа. Ці ўмовы канцэртаў, ці якасць мерапрыемства, часцей настроі ў гурце — усё гэта вызначае якасць канкрэтнага выступу. Такія хібы не абміналі таксама гурту „RIMA”. Існуе ён ужо больш за дзевяць гадоў, рыхтуецца да вялікага, круглага, як бабуліна булачка, юбілею. Надыходзячае дзесяцігоддзе гэта таксама паказчык таго, што жыццё нясло нашым гарадоцкім музыкантам. Былі такія яркія моманты як выступ на „Прыпынку Вудсток”, былі таксама моманты застою. Складаныя моманты спасцігі гурт гадоў два таму. Тады яны са свежай энергіяй пайшлі ў студыю запісаць свой трэці альбом.

— Гэты дыск не называецца „Еці”, толькі „Калевала”, — пачынае гутарку аб новым альбоме вакаліст.

Гутарылі мы пра гэты альбом зусім нядаўна, але праца пачалася гадоў два таму.

— Ужо не хочацца нам пра тое расказваць, — кажуць усе хлопцы як адзін.

З-за неадказнасці людзей, якія тэарэтычна павінны спрыяць гурту, запісаны матэрыял, можна сказаць, адышоў у нябыт. Калі музыкі развялі рукі, з дапамогай прыйшоў ім сябра.

— Адась „Джузва” Юзафовіч, хаця не іграе ў гурце, з’яўляецца яго неразлучнай часткай, — распавядае Андрэй Паплаўскі.

Гэта Адась, які працуе ў Гмінным цэнтры культуры ў Гарадку, задумаў, каб проста напісаць праект у Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якое дафінансоўвае меншасныя праекты і ідэі. Раней такой дапамогай пакарысталіся гурты „5сот5” пры альбоме „X” ці „Ilo&friends” пры дыску „Па дарозе”. Адась сказаў сабе: „Чаму не?”, абмяняўся ідэяй з сябрамі і такім чынам зусім нядаўна на свет з’явіўся трэці — пасля „Праз жыццё” і „Прадаем сябе” — альбом гурту „RIMA”.

— Трэба было нанава запісаць цэлы матэрыял, — кажа „Пеўчы”, як вакаліста называюць калегі. — Можа і лепш, бо, здаецца, тое, што атрымалася, больш складнае і напэўна больш актуальнае.

Калісьці пра гэты віртуальны альбом гутарылі і з-за працяглай працы хтосьці сказаў, што ён—быццам той снежны чалавек еці: нібыта ёсць, але ніхто яго ніколі не бачыў. Вось такая простая гісторыя. Простай затое не здаецца музыка „рімоўцаў”. Дыск „Калевала” — пачатак новага.

„Калевала” — гэта загаловак фінскага эпасу, такой народнай міфалогіі. Аўтар тэксту песні, якая стала загалоўкам альбома гурту „RIMA”, Алесь Аркуш, кажа:

— Свет ёсць як міф, няма нічога абсалютнага, ні рэальнай аб’ектыўнасці. Калі ў тэксце чуеш пра беларусаў: „нас мала”, гэта нічога не абазначае, бо ў іншай сітуацыі нехта скажа: „нас многа”. Гэта ўсё міфы. Такім чынам я беларускую рэальнасць аднёс да міфалогіі. Рэальнасць гурту „RIMA” гэта яе творчасць, але і публіка.

— Цікавіць нас вельмі рэакцыя публікі, але калі будзе нават адмоўная, то мы і так будзем прытрымлівацца свайго, — падкрэслівае Андрэй.

Здаецца, гурту не пагражае музычная маргіналізацыя. За амаль дзесяць гадоў працы прыцягнулі да сябе кола фанатаў. Цікава, што гэта вельмі розныя людзі з не менш рознымі падыходамі да музыкі. Адны вельмі чакаюць кожнай новай прапановы, другія на кожным канцэрце чакаюць старых гітоў, якіх дарэчы шмат. „Дакуль мы будзям”, „Я ўжо прывык” ці „Агурочкі” складаюць беларускамоўную класіку Падляшша. Самі выканаўцы не пазбаўлены сентыменту, таму і трэці альбом адкрывае свежы варыянт песні „Туман ярам”. Пасля трапляем ужо на кампазіцыі ў новым гучанні. Складаецца ўражанне, што ўсе творы больш жорсткія і злосныя, чым раней, хаця не менш эмацыянальныя.

— Найбольш мне падабаюцца дзве песні, — расказвае вакаліст і аўтар большасці тэкстаў, — першая з іх гэта „Ненармальныя”, другая, гэта і другі трэк альбома, „Мой дом”. З імі проста ідэнтыфікуюся.

„Мой дом” — таксама невыпадковая песня. Ведаю Андрэя Паплаўскага шмат гадоў і ведаю, што вельмі паважае ён творчасць Янкі Купалы. На маю думку, у нейкі момант супадаюць спосабы думання вялікага пісьменніка і яго маладога паслядоўніка.

— Верш Купалы ў цудоўны спосаб распавядае пра любімую прастору, пра... што я буду гаварыць, люблю Гарадок.

Усё павінна быць зразумелым. Розныя бываюць вымярэнні любові, але прывязанасць да месца, да людзей, да свайго часта немагчыма выказаць простымі словамі. Таму і Андрэй часам карыстаецца дапамогай тых, якія знайшлі самыя лепшыя словы, каб выказаць тое, пра што мы думаем прынамсі раз у дзень, але не ўмеем сказаць.

На альбоме знойдзем таксама „Смерць мужыка”. „RIMA” любіць перш за ўсё сцэнічныя эксперыменты, таму здаралася нам бачыць разам з імі танцорак ці жанчын з калектыву „Расспяваны Гарадок”. Цяпер на дыску маем магчымасць пачуць скрыпку. Якраз у песні „Смерць мужыка”.

— Яна на словы нашага мясцовага паэта, — ганарыцца Андрэй Паплаўскі, — вядомага пад псеўданімам Арол (Сцяпан Пятэльскі — рэд.). Яго няма ў жывых, але творчасць застаецца вечнай.

Маладыя музыкі вяртаюць такім чынам памяць сучаснаму грамадству, памяць пра іх мінулае. Затое я заўсёды буду паважаць гурт „RIMA”. Яны не баяцца быць шчырымі, не прабуюць ставіць сябе вышэй, чым дазваляюць прыхільнікі, прытым іграюць вельмі прыстойна ды са зразуменнем. Разумеюць хаця б тое, што да песні „Смерць мужыка” самым лепшым інструментам з’яўляецца скрыпка, адзіны інструмент, які ў змозе заплакаць. Мы, пэўна, слухаючы гэты дыск, не заплачам, бо і не такі ўхіл творчасці гурту. Я напэўна буду захапляцца гітарнымі гармоніямі, а што, паводле вас, стане козырам альбома — напэўна ацэніце, калі неўзабаве дыск трапіць у вашы рукі.

Кожны раз, калі ў нашым невялічкім беларускім, падляшскім свеце адбываецца такая важная падзея, варта ёю пацікавіцца і паўтарыць іншым, што вось паказаўся чарговы дыск падляшскіх музыкантаў. Дыск беларускамоўны, які ставіць чарговы крок для выратавання нашай мовы, захавання яе для наступных пакаленняў.

**Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК**

Фарыд БЕРАШЭД

# Ці патрэбна нам Беларуская Смаленшчына?

На сённяшні дзень беларуская меншасць у Польшчы мае той мінімальны набор умоў, якія мусяць спрыяць яе развіццю. Ужыванне роднай мовы для пазначэння тапаграфічнай інфармацыі і ўласных назваў, свой друк і навучанне, — тыя чыннікі, якія вызначаюць „еўрапейскі" падыход да абароны правоў нацыянальных і этнічных меншасцей.

Ці дапамогуць гэтыя меры беластоцкім беларусам захавацца ў якасці асобнай нацыянальнасці, а не „праваслаўных палякаў" — іншае пытанне. Разважаць тут можна колькі заўгодна і толькі гіпатэтычна. Па словах варшаўскага лінгвіста Міраслава Янковяка, знаёмага аўтара гэтых радкоў, моўная сітуацыя на Беласточчыне пакуль не можа цешыць: усё менш і менш носьбітаў мовы, усё больш і больш пальшчызны ў паўсядзённай гаворцы. У нумары „Нівы" ад 19 ліпеня, нібы ў дакор беларусам, падаецца матэрыял пра ўвядзенне падвоеных назваў у Пунску — „тутэйшыя" паводзяць сябе рыхтык як пры жыцці нябожчыка Мікалая II Раманава. Што будзе, калі тубыльцы стануць цалкам польскамоўнымі? Ці здолее Праваслаўная царква кансалідаваць насельніцтва вакол сваёй нацыянальнасці? Або можа беларусы пойдуць шляхам амаль згубіўшых сваю рэліктавую мову іспанскіх баскаў, самасвядомасці якіх можна толькі пазайздросціць? Хочацца верыць, што беластоцкая моладзь, якая з'язджае з вёсак у гарады, не зрачэцца сваіх каранёў.

Самы благі канец, які б можна было ўявіць для Беласточчыны, добра адлюстроўваецца на прыкладзе паўднёва-заходняй часткі Смаленскага краю, або Беларускай Смаленшчыны, насельніцтва якой яшчэ на пачатку XX ст. нічым не адрознівалася ад сваіх суседзяў з Магілёўшчыны і Віцебшчыны.

Смаленчукі з 1514 г., з невялікім перапынкам, знаходзіліся ў складзе чужога дзяржаўнага арганізму — Расіі. Нават калі геасацыёрная мяжа „турмы народаў" пасунулася ў 1772-1795 гг. на захад, насельнікі паўднёва-заходняй Смаленшчыны заставаліся ў этнічных адносінах беларусамі. „Беларусамі" не ў сэнсе нацыянальным, а выключна этнаграфічным. Акружаныя вялікарускай аднавернай большасцю, тутэйшыя вяскоўцы ў сваёй „беларускасці" маглі абаперціся толькі на мясцовыя дыялекты і традыцыйную культуру, якія, натуральна, у гэтым ім слаба дапамагалі. Як на поўдні Беласточчыны ўкраінскія моўныя рысы не адыгралі вызначальнай ролі ў канструяванні ўкраінскай нацыянальнай свядомасці мясцовых сялян, так і беларускія этнічныя маркеры Смаленшчыны не спрыялі краёвай „беларусізацыі".

У сувязі з гэтым цікава прывесці сведчанні вядомага лінгвіста Паўла Растаргуева, які сцвярджаў, што яшчэ ў дарэвалюцыйны час смаленскімі сялянамі выказваліся патрабаванні да настаўнікаў, каб яны звярталі ўвагу і сачылі за мовай вучняў, прывіваючы ім „маскоўскае" вымаўленне.

У 1920-я гг., падчас савецкай „каранізацыі" — палітыкі ўрада РСФСР па пераводзе на родную мову дзяржаўных устаноў „нацменскіх" раёнаў — сітуацыя практычна не змянілася. Наадварот, асіміляцыя ахапіла большую колькасць людзей. Для прыкладу, у справаздачы 1932 г. па беларусізацыі ў Манастыршчынскім раёне Смаленскай губерні адзначалася, што „каранізацыя школ за 5 год адчувальных вынікаў не дала, бо мова мясцовага насельніцтва не з'яўляецца беларускай, а нечым сярэднім". Сухія радкі дакументаў тых дзён малююць нам даволі сумную карціну смаленскай беларушчыны: „беларускае насельніцтва, у большасці сваёй, ставіцца да мовы індыферэнтна. Бываюць выпадкі актыўнага процідзеяння арганізацыі школ на роднай мове".

Як ні дзіўна, у міжваенны перыяд на паўднёвым захадзе Смаленшчыны назіраліся і кволыя парасткі нацыянальнай свядомасці. Пасля ўзбуйнення Беларусі ў 1924 г., прыпісаныя да Смаленскай губерні РСФСР жыхары, адсылалі прашэнні ва ўрад БССР аб далучэнні іх вёсак да Беларусі. Так зрабіла насельніцтва вёсак Вялікі Рай, Малы Рай і Свірыдаўка Бахоцкай воласці, жыхары Аслянскай воласці і іншых раёнаў Смаленскай губерні. Размежаванне прывяло да штучнага падзелу тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак, а людзі апынуліся ў нязручнай для гаспадарання і жыцця сітуацыі — тут і трэба шукаць, бадай, асноўную прычыну ўсплёску „нацыянальнай свядомасці" заходніх смаленчукоў. Як на паваеннай Беласточчыне просты селянін гатовы быў запісацца мала не ў юдэі, каб толькі пазбегнуць сталінскага калгаснага раю, так і жыхары смаленска-магілёўскага памежжа аператыўна парабіліся беларусамі, абы не ездзіць далей за Мсціслаў да лекара. Варта падкрэсліць і вышэйшы ўзровень жыцця ў БССР, бо, напрыклад, на той час стаўкі заработнай платы для 1 разраду ў Смаленскай губерні раўняліся 4 рублям, а ў суседніх паветах Беларусі — 7 рублям.

Не трэба забывацца і на прысутнасць у губерні нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі, як мясцовай, так і прыезджай з БССР. Вядома, што сярод студэнтаў Беларускага зямляцтва ў Смаленску, якое дзейнічала ў 1920-я гг., ураджэнцы Смаленскай губерні складалі каля 20% ад ліку ўсіх яго членаў. Студэнты займаліся беларускай культурна-асветнай працай не толькі сярод сваіх членаў, але і ў вёсках губерні, прапагандуючы пераход людзей на беларускую мову.

Савет па асвеце беларусаў пры мясцовай адміністрацыі, Беларуская секцыя Смаленскага аддзела народнай адукацыі і беларускія школы губерні гартавалі Смаленшчыне нацыянальна свядомыя кадры. Асветная праца дала свой плён і былі прыклады, калі навучэнцы ахвотна займаліся на беларускай мове, а беларуская школа мела аўтарытэт. Праўда, такіх навучальных устаноў было ў параўнанні з іншымі мала.

У 1920-я гады Смаленшчына падаравала Беларусі трох таленавітых і самабытных літаратараў. Першы — Зміцер Астапенка — быў ураджэнцам вёскі Калеснікі (Хіславіцкі раён Смаленскай вобласці) і напісаў першы беларускі навукова-фантастычны раман „Вызваленне сіл". Загінуўшы заўчасна ў сталінскіх вязніцах Сяргей Фамін быў прадстаўніком Манастыршчыны. Тыповы маладняковец, Фамін спяваў гімн Кастрычніку, барацьбе новага са старым, радасці маладосці. Імя Спірыдона Міхальцова, ён жа Воцьлахім, для Максіма Гарэцкага сведчыла аб тым, што „беларусізацыя зрабіла значныя крокі, а беларуская культура (...) прыцягвае і людзей узгадаваных на іншых культурах, але звязаных з Беларуссю". Сам пісьменнік быў з Дарагабужскага павета і вельмі добра авалодаў беларускай літаратурнай мовай, пішучы на ёй апавяданні.

У 1930-я гг. палітыцы беларусізацыі паўднёва-заходняй Смаленшчыны прыйшоў канец, а яе актывісты зніклі ў шматлікіх ямах прыгарадных лясных масіваў. Дзе цяпер тая Беларуская Смаленшчына? Яна дажывае свой век разам з сівымі бабулькамі, якія сядзяць самотна пад каравымі таполямі, паабапал клятых яшчэ немцамі няроўных дарог. Сам тэрмін „Беларуская Смаленшчына" ў расійскім друку даўно не ўжываецца, і толькі ў самых аб'ектыўных працах сучасных расійскіх даследчыкаў можна прачытаць, што „в целом ряде элементов культуры и языка западнорусской этнографической группы прослеживается влияние соседнего белорусского населения". Распрацаваныя яшчэ імперскімі гісторыкамі старыя як свет міфалагемы пра „каменное ожерелье земли русской" і „ключи от Москвы" дапаўняюцца сучаснымі высновамі лінгвістаў і гісторыкаў пра шырокі ўплыў польскай мовы на мясцовыя „заходнерускія" гаворкі і польска-літоўскае ярмо часоў сярэднявечча.

Калісьці Сакрат Яновіч выказаўся вельмі негатыўна супраць развіцця „ўкраінства" на Беласточчыне, адмаўляючы яму ў жыццяздольнасці. Ці будзе новая беларусізацыя Смаленшчыны, ажыццяўляемая шляхам прыватных ініцыятыў ці беларуска-расійскіх дзяржаўных дачыненняў, анахранізмам? Можа нам усім трэба спыніць свой трэнас па „згубленых землях" і абмежавацца навуковай літаратурай? Ці ўсё ж такі варта „абудзіць" мясцовую моладзь, павёўшы яе „пад родным сцягам да светлае будучыні"? Пытанне застаецца адкрытым.

P.S. Аўтар артыкула прапануе ўсім ахвотным абмеркаваць пастаўленае пытанне на адмысловым інтэрнэт-форуме сайта „Беларуская Смаленшчына".

http://www.smalensk.webstolica.ru/

## Чаромхаўскія канікулы

Скончыліся канікулы. Час у школу. 1 верасня прагучаў першы званок і дзеткі вярнуліся да штодзённых школьных абавязкаў. На адным з урокаў малечы пэўна ўспомняць канікулы і напішуць сачыненне аб тым як правялі летні адпачынак, чым займаліся... Я падобнае пытанне паставіў працаўнікам Чарамхоўскага ГОКа. Вось, што пачуў у адказ:

— Не будзем хваліцца, калі скажу, што сёлета мы найлепш арганізавалі працу з дзеткамі ў наваколлі, — пачала дырэктар Барбара Кузуб-Самасюк. — Праўда, пакарысталіся для гэтай мэты адпаведнымі сродкамі двух праектаў: „Szkoła tradycji — działania kultywujące ginące rzemiosła" Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства, і „Letnie Aktywacje" — program Działaj Lokalnie VI на сродкі Амерыканскага фонду свабоды пад патранатам Акадэміі разіцця філантропіі ў Польшчы і Згуртавання самаўрадаў Еўрарэніёна „Белавежская пушча", а таксама ўласнымі сродкамі Чаромхаўскага таварыства любіцеляў народнай культуры. Трэба адзначыць, што апрача фінансавай дапамогі неабходна была і належная праца шматлікага калектыву людзей. А ў Чаромсе такія знайшліся.

На пачатку канікул, — працягвае суразмоўца, — арганізавалі мы дыскатэку. Было гэта 27 чэрвеня. Падобныя мерапрыемствы ладзіліся па пятніцах і суботах. Пры канцы чэрвеня дзеткі займаліся бацікам (размалёўваннем тканін), рабілі кветкі з тонкай паперы.

З пачаткам ліпеня (да канца канікул) па серадах і пятніцах пад наглядам Уршулі Якуць праводзіліся пластычныя заняткі малявання на шкле, рысавання, жывапісу ды іншыя. З атрыманых

*За кроснамі Надзея Данілюк са сваімі вучаніцамі*

прац была арганізавана выстаўка, якую можна паглядзець і зараз у калідоры клуба. Былі арганізаваны веласіпедныя экскурсіі па наваколлі. Вялікім зацікаўленнем карысталася навучанне тканню на кроснах і саломапляценню. Гэтамаму рамяству навучалі жыхарка Кузавы Надзея Данілюк і працаўніца ГОК Ніна Ефімюк. Спадарыня Анна Зінкоў арганізавала дзеткам практыкаванні на аснове ёгі. Рэня Ганглеўская навучала тканню на раме ды жанглёрству агнём. Ад 6 па 14 жніўня пад кіраўніцтвам Ізы Грыка праводзіліся заняткі па танцах, а з 21 па 23 жніўня ўдзельнікі вывучалі капаэйру. Пры канцы жніўня ( 22-23) быў арганізаваны валейбольны турнір, быў касцёр са шматлікімі гульнямі і конкурсамі. А зацікаўленне мерапрыемствам як малеч, так і старэйшай моладзі было вялікае. Адным словам, чаромхаўскія школьнікі не маглі нудзіцца ў час канікулаў, — завяршыла свой расказ дырэктар ГОК.

Гэта пацвярджае і ніжэйпадпісаны, які быў навочным сведкам некаторых мерапрыемстваў.

**Уладзімір СІДАРУК**

# Пятая летняя пабыўка партызанскай школы ў Гданьску

**Ужо пяты год запар у першай палове жніўня ў Гданьск прыязджаюць навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа, які з верасня 2003 г. дзейнічае ў падполлі пасля яго закрыцця ўладамі. У складаных умовах прыйшлося весці навучанне, бо ж любой школе патрэбнае памяшканне, парты, крэслы, табліца... А калі гэтага ўсяго пазбаўляюць, дык як вучыцца? Вырашылі вучыцца па хатах, наймалі памяшканне, але і вырашылі памяняць крыху каляндар навукі. Звярнуліся з заявай да школ у Польшчы за дапамогай. Вядома, канікулы і школы стаяць пустыя. Адгукнулася не так і мала школ і прыватных асоб, між іншым, з Варшавы і Гданьска.**

Фота Марка РЭДЗІМСКАГА

У Гданьску мне асабіста прыйшлося мець дачыненне да летняга навучання беларускіх ліцэістаў. Неяк пазваніла мне мая былая студэнтка, якая вучыць грамадазнаўству ў комплексе школ інжынерыі асяроддзя з пытаннем пра беларускі ліцэй. Маўляў, дырэктар можа іх прыняць, але хоча ведаць, што гэта за школа, калі яе ліквідавалі, чым яна нямілая ўладам? Прыйшлося заручыцца за ліцэй, якому пабыўку ў Гданьску я арганізавала двойчы — у 1992 і 1996 гг. Тады школа была вядомая ў Беларусі сваім узроўнем і нішто не прадказвала, што яе закрыюць. Дарэчы, у тыя гады знайсці спонсараў іх пабыўкі не было так і лёгка. Пачынаючы з 2005 г. беларускія ліцэісты прыязджаюць на два тыдні вучыцца менавіта ў вышэйзгаданы комплекс школ. Яго дырэктар Аляксандр Нагуцкі, дзякуючы падтрымцы ўлад горада Гданьска, арганізуе навучанне, аддаючы прадметныя кабінеты, а бурсу і сталоўку — для пражывання і харчавання. Сам на працягу двух тыдняў ангажуецца ў апеку над беларускай моладдзю. Традыцыяй сталі сустрэчы ліцэістаў з мясцовымі беларусамі. Нягледзячы на летні сезон, збіраецца больш за дзесяць асоб; заўсёды Мацей Канапацкі, Міхась Куптэль, Чэсь Мекін, Уладыслаў Страшэвіч, ды аўтарка гэтых радкоў. Пакуль жыў св. п. Юры Аляхновіч, сын вядомага беларускага драматурга, таксама прыязджаў. На сустрэчы з ліцэістамі была таксама ўнучка Лукі Дзекуця-Малея. Цяпер перад дзецьмі з дакладам выступіў Мацей Канапацкі, які расказаў пра свайго бацьку, яго беларускую дзейнасць і пра сябе, асабліва пра перыяд працы ў „Ніве". Падаркі вучням — кнігі Міколы Дварэцкага „Там і тут", пэйджыкі ды аўтаручкі падарыў вучням Юры Дварэцкі з фірмы „Трэс". Вучні таксама нас радуюць, бо рыхтуюць дзеля сустрэчы мастацкую праграму — спевы, танцы, дэкламацыі, апавяданне сваіх уражанняў ад Гданьска. На такім мастацкім заканчэнні навучання ў Гданьску прысутнічаў віцэ-прэзідэнт горада Мацей Лісіцкі, які пажадаў, каб моладзь прыязджала ў Гданьск адпачываць, а не вучыцца; каб маглі нармальна вучыцца ў Беларусі. Апрача дырэктара Аляксандра Нагуцкага былі таксама яго настаўнікі.

У перапынках між навукай ладзіліся ім экскурсіі, м. інш. у нядзелю паплылі водным трамваем у Гэль, дзе наведалі акіянарыум і музей, прысвечаны цюленям, ды купаліся ў моры і загаралі на пляжы. У суботу сустрэліся з прэзідэнтам Гданьска Паўлам Адамовічам, які прызнаўся да сваіх беларускіх каранёў і расказаў пра толькі што здзейсненую ім паездку на бацькаўшчыну — у Смаргонь, Полацк... Дзеці і настаўнікі атрымалі ад яго рэкламныя пакецікі з падаркамі.

З 2007 г. ліцэісты абавязкова наведваюць таксама камень, прысвечаны Янку Купалу. Спяваюць там песні на словы паэта, чытаюць яго вершы, на канец фатаграфуюцца на памятку.

Думаю ўсім ім — і вучням, і настаўнікам — Гданьск назаўсёды застанецца ў памяці як свабодны горад, у якім нават пражываюць беларусы, дзе палякі ставяцца да іх лепш, чым улады на бацькаўшчыне. На гэты раз навучалі іх вядомыя даследчыкі і дзеячы: Алег Трусаў, Валянцін Голубеў, Лявон Баршчэўскі. Уладзімір Колас, дырэктар ліцэя, вымушаны быў з'ехаць пару дзён раней — павёз чацвёра ліцэістаў на міжнародны летнік у Друскенікі.

**Лена ГЛАГОЎСКАЯ**




Многія раскіданыя па свеце беларусы ўпэўненыя, што іхняя Бацькаўшчына павінна мець лепшы лёс ад цяперашняга. Нягледзячы на значна больш заможнае і свабоднае жыццё, чым тое, якім жывуць суайчыннікі на радзіме, яны не парываюць нябачнай духоўнай сувязі з Беларуссю, стараюцца зрабіць хоць штосьці на карысць яе, а не цяперашніх улад.

У лістападзе 2006 года на старонках „Нівы" распавядалася аб сайце Беларускага моладзевага руху Амерыкі (БМРА). За прайшоўшы час прысутнасць у інтэрнэце жывучых за акіянам беларускіх патрыётаў павялічылася — напрыклад, у сусветнай павуціне з'явіўся сайт вашынгтонскай суполкі гэтага руху.

Сайт вашынгтонскіх беларусаў месціцца па адрасе http://belmovdc.org. Галоўная старонка на першы погляд нязначна адрозніваецца ад агульнаамерыканскага сайта БМРА. Толькі з правага боку замест выявы Тадэвуша Касцюшкі месціцца фотаздымак Белага дома. Што ж тычыцца інфармацыйнага напаўнення, то тут, канешне, вашынгтонскі сайт саступае агульнаамерыканскаму. Гэта зразумела, бо Вашынгтон гэта далёка не цэлая Амерыка, таму падзей тут адбываецца значна меней. Але вельмі добра, што беларусы сталіцы ЗША вырашылі больш падрабязна знаёміць са сваёй дзейнасцю астатні свет.

Праўда, знаёмства з сайтам беларускай моладзі ў Вашынгтоне адразу спараджае пытанні, на якія, на жаль, адказ адшукаць немагчыма. Па-першае, зусім незразумела, што на сённяшні дзень уяўляе з сябе вашынгтонская суполка БРМА. Нідзе на сайце расповеду пра арганізацыю і яе сяброў няма. Па-другое, інтэрнэт-сувязь з агульнаамерыканскім сайтам амаль не афішуецца, а пераход на яго магчымы толькі праз банэр, што месціцца ў правым ніжнім вугле выяўлення, які не адразу ўдаецца адшукаць.

Што ж тычыцца рубрык сайта, то іх не надта многа. Больш таго, галоўная старонка з'яўляецца практычна паўтарэннем рубрыкі „Навіны". Таксама паўтараюцца матэрыялы ў „Артыкулах". Такія хібы варта было б выправіць, калі вашынгтонскім беларусам залежыць на больш прафесійнай падачы інфармацыі.

Рубрыка „Абвесткі", як не дзіўна, змяшчае як паведамленні аб будучых падзеях, так і аб тых, што ўжо адбыліся. Гэта, у сваю чаргу, выклікае пытанне: у чым тады заключаецца яе адрозненне ад старонкі, дзе месцяцца навіны?

Старонка „Кантакты", згодна сваёй назве, падразумявае дачыненні з нейкімі канкрэтнымі асобамі. На жаль, уладальнікі сайта па традыцыі, пайшоўшай, відаць, ад беларускіх калег, лічаць за лепшае застацца інкогніта. Гэта больш чым дзіўна, бо наўрад ці ўлады ЗША пачнуць пераслед за дзейнасць на карысць дэмакратыі ў Беларусі, а абазначэнне саміх сябе з'яўляецца звычайнай нормай не толькі ў цывілізаваных краінах.

Рубрыка „Спасылкі" прадстаўляе з сябе вялікі пералік выйсцяў на розныя сайты нацыянальна-адраджэнскай накіраванасці. Без ваганняў можна сказаць, што даная рубрыка зроблена найбольш прафесійна ў параўнанні з іншымі. Спасылкі на сайты размеркаваныя па некалькіх раздзелах — інфармацыйныя выданні, партыі і рухі, персанальныя старонкі, сайты гарадоў, музыка і культура, грамадскія арганізацыі.

Плюсамі сайта вашынгтонскай беларускай моладзі з'яўляецца таксама пошукавы сэрвіс і англамоўная версія.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

**„Жніво" на вадзе**

Спартовай камандай мінулага месяца без сумнення можна назваць мужчынскую зборную Беларусі па веславанні на байдарках і каноэ, якая на чэмпіянаце свету заваявала 7 залатых узнагарод. Сапраўднае рэкорднае „жніво" на вадзе! А яе настаўніка Уладзіміра Шантаровіча — лепшым трэнерам. Пра гэты поспех было расказана ў мінулым нумары „Нівы", а зараз вылучым толькі асобных прадстаўнікоў.

Адзначым таксама 7 медалёў айчынных вадналыжнікаў на чэмпіянаце Еўропы ў дысцыпліне за катэрам, які прайшоў у Даніі. Трэці год запар зборная Беларусі па мотаболе заваявала сярэбраныя ўзнагароды першынства кантынента. Нашы гімнасткі-„мастачкі" ўзялі медалі ўсіх вартасцей у групавых практыкаваннях на мінскім турніры серыі Гран-пры. Сярод клубаў зноў вызначыўся футбольны барысаўскі БАТЭ, які з праблемамі, але ўсё ж выйшаў у асноўны турнір Лігі Еўропы і прадоўжыў заўзятарам сезон аж да зімы. Хакейны Кубак Беларусі выйграла сталічнае „Юнацтва". Урэшце пару добрых слоў заслугоўвае і мужчынская баскетбольная дружына, якая з прыгодамі, але ўсё ж дамаглася свайго — выйшла ў накаўт-раўнд і будзе змагацца за вяртанне ў элітны дывізіён. Далей па завядзёнцы вылучаем дзесятку персаналій, крыху аддаючы прыярытэт атлетам-мужчынам.

**1. Раман Петрушэнка і Вадзім Махнеў** (веславанне). Алімпійскія чэмпіёны двойчы ўзышлі на верхнюю прыступку п'едэстала пасля парных заездаў на 500 і 200 метраў, а яшчэ два залатыя медалі заваявалі ў складзе экіпажу-чацвёркі.

**2. Дзяніс Гаража** (веславанне). Новая ўзыходная зорка айчыннага веславання. Дзяніс першынствааў у каноэ-адзіночцы на дыстанцыі 500 метраў і ўзяў золата ў складзе чацвёркі на кіламетровым адрэзку.

**3. Сяргей Шундзікаў** (дзюдо) стаў сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету, які прайшоў у Ратэрдаме. Ён дасягнуў поспеху ў вагавай катэгорыі да 81 кілаграма. На жаль, іншыя лідары зборнай не пацвердзілі свайго высокага рэйтынгу.

**4. Герман Белякоў** (вадналыжны спорт) стаў чэмпіёнам у фігурным катанні за катэрам і трэцім прызёрам у шматбор'і.

**5. Алег Дзевятоўскі** (вадналыжны спорт) тройчы ўзыходзіў на п'едэстал — тры сярэбраныя ўзнагароды ў розных намінацыях.

**6. Павел Лыжын** (лёгкая атлетыка) на чэмпіянаце свету ў Берліне ў штурханні ядра паказаў свой лепшы вынік, што прынесла яму 6-е месца.

**1. Кацярына Хадатовіч-Карстан** (акадэмічнае веславанне) зноў пацвердзіла свой феноменальны дар. На чэмпіянаце свету ў Познані беларуска ўпершыню ў сезоне выйшла на старт, а ўрэшце ўпэўнена выйграла шосты (!) чэмпіёнскі тытул у адзіночнай лодцы.

**2. Меліта Станюта** (мастацкая гімнастыка) на этапе Кубка свету BelSwissBank у Мінску здабыла адзін сярэбраны і ажно чатыры бронзавыя медалі. У шматбор'і яна стала трэцяй, другой у практыкаванні са скакалкай, а яшчэ вызначылася ў відах з абручом, мячом і стужкай.

**3. Людміла Ваўчок** (акадэмічнае веславанне). Сярэбраная медалістка пекінскай параалімпіяды на чэмпіянаце свету ў так званай адаптыўнай намінацыі на кіламетровай дыстанцыі заваявала бронзавы медаль.

**4. Наталля Берднікава** (вадналыжны спорт) стала чэмпіёнкай кантынента ў фігурным катанні, а таксама сярэбранай прызёркай у камандавым першынстве.

Па-за спісам апынулася яшчэ колькі вартых спартоўцаў, дасягненні якіх крыху „схаваліся" за агульным камандавым поспехам. Будзем спадзявацца, што будзе нагода прыгадаць пазней і пра іх.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Слова Васю

Нечаканая сустрэча з сябрам Васем на вуліцы ў Бельску-Падляшскім і гутарка пра мінулае амаль трыццацігадовай даўнасці ды цяперашняе дала мне стымул для напісання гэтых слоў. Сябра жыве над Балтыйскім морам у Гдыні, мае свой асабняк, удалую сям'ю і ўвогуле маецца няблага. У ходзе гутаркі я паставіў пытанне: „Як выглядае сапраўдны лёс бедных суднабудаўнікоў?". Яны і плябаны змагаліся да апошняга, каб вярнуць капіталізм і ляпалі рукамі і языком у касцёле св. Брыгіды. А цяпер да каго ў іх жаль і прэтэнзіі?.. Ці за такі капіталізм яны змагаліся, моцна жаданы імі, дзікі? Вася з хваляваннем адказаў мне:

„Вось спрабуем сарганізаваць краму па продажу салаты і пятрушкі, дык калі не будзем мець прыбытку, хутка яе зачынім. А *яны* чаго хочуць?! Выглядае на тое, каб мы абодва са сваіх падаткаў утрымлівалі неўдалот?! Вось, няхай сабе падпісваюць экспартны кантракт, будуюць караблі, прадаюць; з прыбытку можна жыць. Я не маю намеру падтрымліваць лёгкадумцаў і крыкуноў. Працаваў я суднабудаўнікам у Гдыні. Заробкаў хапала, змог я паставіць дом, абсталяваць яго, не працягваючы рукі да дзяржавы. Жыў ашчадна, не раскідваўся лішне грашом, дык з мяне смяяліся: „Jedz, pij i popuszczaj pasa, jak za króla Sasa". Працуючы на суднаверфі, я заўсёды меў гарачае малако, гарбату і каву дарма, датаваныя сталоўкі, у якіх за пяць злотых можна было з'есці смачны абед. Усе памятаем, як калісьці Гамулка павысіў цану мяса, першы раз за некалькі гадоў. Гэтага хапіла, каб непатрэбна загінулі людзі на вулічных дэманстрацыях імі сарганізаваных. Чаму яны цяпер не пратэстуюць, калі кожны гандляр выстаўляе цану паводле свайго капрызу?! І дзе цяпер знаходзяцца тыя плябаны і Нобелеўскі лаўрэат, якія так спакушалі малітвай і другой Японіяй? Цяпер супакойваюць суднабудаўнікоў тыя самыя плябаны, бы пчол у вуллі, дымам і свянцонаю вадою! Усё, што цяпер адбываецца, тварыцца па іх жаданні. А маглі мы спакойна жыць і працаваць..."

На канец пачуў я моцны мядзведжы поціск Васевых сяброўскіх абдымкаў суднабудаўніка родам з нашага стороння.

**Сцяпан КАРБОЎСКІ**

## НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

# У Васількаве

Васількава ляжыць пры шашы Гайнаўка — Беласток. Гэта малая вёсачка з 23 жылымі дамамі. Частка дамоў ужо пустуе. У пераважнай большасці астатніх пражываюць пенсіянеры. З аднаго пункту гледжання можна сказаць, што гэта глухі куток. Няма ў вёсцы ні школы, ні магазіна. Харчпрадукты жыхарам пастаўляюць аўталаўкі з Гайнаўкі і Нарвы.

У Васількаве няма каналізацыі. Вёска распаложана на нізкім, падмоклым грунце. Пры камуне мела быць праведзена дрэнажаванне, але першапачаткова людзі не згадзіліся. А потым прыйшлі перамены, памяняліся прыярытэты сельскагаспадарчай палітыкі і аб дрэнажаванні ніхто ўжо нават не ўспамінае. Моладзь пасля заканчэння школы ўцякае ў перанаселеныя гарады, у якіх людзі змагаюцца са штодзённымі складанасцямі, перш за ўсё з беспрацоўем.

З другога гледзішча можна гаварыць і аб станоўчых баках. Гэта спакойная, бесканфліктная вёска, жыхары якой нават не ведаюць свайго ўчастковага (у некаторых вёсках паліцыя бывае частым госцем).

Даезд да шашы тут вельмі добры, па асфальце. Аднак людзі з нецярплівасцю чакаюць асфальтавага насцілу на дарозе з Васількава ў Дубіны і спадзяюцца, што ў недалёкім будучым гэтую праблему вырашыць ім войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч, якая ў грамадстве карыстаецца добрай рэпутацыяй.

Самыя пажылыя вяскоўцы — гэта Міхал Ваўранюк (яму 96 гадоў) і яго жонка. Малодшыя жыхары займаюцца сельскай гаспадаркай. Солтыс Ян Нічыпарук загатаўляе сена, якое прадае ў Белавежу ў якасці корму для зуброў. Міраслаў Пташынскі вырошчвае збожжа і вядзе сталярню. Жывёлаводствам займаюцца Аляксандр і Ян Каролькі.

Суседняя вёска, у якой канфліктаў хоць адбаўляй, павінна ўзяць прыклад з Васількава, жыхары якога жывуць дружна і мірна.

**Андрэй ЯЛОЗА**

# Развітанне з традыцыйнай лямпачкай

З 1 верасня выводзяцца з гандлёвага абароту традыцыйныя электрычныя лямпачкі напальвання магутнасцю 100 ват і больш, каляровыя і матавыя. Іх заменяць энергазберагальныя лямпачкі — галагенавыя, люмінесцэнтныя і святлодыёдныя. Такое рашэнне прынялі міністры энергетыкі Еўрапейскага Саюза. Аднак цана новых лямпачак будзе некалькі разоў большая. Прадбачваецца, што кошт адной складзе 16-19 зл. Калі ўлічыць энергаашчаднасць лямпачак, то ў гадавым маштабе за скарыстаную электраэнергію заплацім менш, чым пры традыцыйных. Для прыкладу: традыцыйная 100-ватовая лямпачка зрасходвае электраэнергіі на 79 зл., а адпаведная ёй 25-ватовая энергазберагальная — на 19 зл. Яшчэ больш зэканомім на „шасцідзесятках" ці „саракоўках". Іх энергазберагальныя адпаведнікі ў першым выпадку зразходваюць энергіі на 9 зл. у год, а ў другім — на 7 зл. У наступным годзе прадбачваецца выключэнне з продажу лямпачак магутнасцю 75 ват, у 2011 — 60 ват, а ў 2012 годзе — 40 і 25 ват. Такім чынам адбудзецца канчатковае вывядзенне з абароту традыцыйных лямпачак. Ёсць яшчэ адна заўвага. Паколькі энергазберагальныя лямпачкі змяшчаюць у сабе ртуць, іх нельга выкідаць у сметніцу, адно трэба здаваць у пункты продажу. Абавязак прымаць выкарыстаныя лямпачкі будзе ўскладзены на гандлёўцаў.

**(ус)**

# Рынак у Нарве

Паводле расказаў старажылаў, рынак у Нарве заўсёды адбываўся па аўторках. Тут пры санацыі можна было купіць і прадаць каня, карову і ўсякую іншую хатнюю жывёлу. У Нарву на рынак прыязджалі купцы і прадаўцы з такіх адлеглых мясцовасцей як Ялоўка, Гарадок, Нараўка ды з Бельска-Падляшскага. Быў гэта вялікі кірмаш. Пры саветах у 1939-1941 гадах і ў час нямецкай акупацыі рынак у Нарве быў закрыты, была забарона гандляваць хатняй жывёлай.

Пасля вызвалення краіны з-пад нямецкай акупацыі рынак у Нарве зноў стаў функцыянаваць па аўторках, а калі адкрылі пункт скупкі жывёлы, людзі сталі везці свіней і быдла на гэты пункт. У шасцідзесятыя-васьмідзесятыя гады на пункт пастаўлялі па 200 і больш штук свіней, а быдла па 100 штук, дык той пункт быў адкрыты па аўторках і пятніцах. Бывала, што людзі са свіньмі стаялі ў чарзе аж да будынка асяродка здароўя, а часам аж да банка. Пры пункце скупкі ў аўторкі на базары можна было купіць парасят, быдла і розныя гаспадарчыя вырабы. Цяпер, калі працуе рыначная эканоміка, пачалі ўсё, што збудавана пры камуне прадаваць за бясцэнак. Пляц і будынак, дзе скуплялі жывёлу, купіў Ян Селеванюк. Прапаў пункт скупкі жывёлы і рынак, толькі гміная ўправа ў цэнтры Нарвы паставіла сталы з дашкамі, дзе таксама па аўторках адбываецца гандаль. Сюды прывозяць абутак, адзенне, садавіну і гародніну, а вясной многа саджанцаў раслін. На машыне прывозяць з Гайнаўкі халадзільнікі, пральныя машыны, газавыя печкі. Хто прывязе свой тавар на машыне, раскладвае яго на невялікім пляцыку каля парку перад будынкам старога пажарнага дэпо, які цяпер прыгожа адрамантаваны. У гэтым будынку праводзяцца вяселлі, танцы, сямейныя пачастункі — пачаўшы ад камуніяў аж па трызны. Пажарнікі маюць цяпер свой будынак па вуліцы Міцкевіча — там стаяць гаражы для пажарных машын і тушыльных прылад (побач іх змяшчаюцца дом культуры і гмінная бібліятэка). Варта ў аўторак заехаць на нарваўскі базар!

**Мікалай ЛУК'ЯНЮК**

# Адгаданка

| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 11 | 12 | 13 | 14 | | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |

**Шыфраграма**

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне.

1. невялікі дом = 6 _ 16 _ 18 _ 5 _ 15 _;
2. зялёны колер, расліннасць = 7 _ 8 _ 1 _ 2 _ 9 _ 10 _;
3. нітка = 4 _ 19 _ 20 _ 21 _;
4. агульнавядомая, збітая ісціна = 3 _ 17 _ 14 _ 12 _ 11 _ 13 _.

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 31 нумара**

Вораг, балван, атэлье, Леў, ключ, тры, сок, Пскоў, удар, красавік, бюро, мята.

Рашэнне: **Чалавек гэта ўскосны прадукт любві.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
*Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

**Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

**Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 000 egz.

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

# У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі...

— 2 —

*(пачатак у № 35)*

Рымска-каталіцкія і праваслаўныя могілкі ў Ялоўцы знаходзяцца за адным мурам. Лінія падзелу між канфесіямі пазначана тут у рэзкі, хоць непрыкметны, спосаб. Яна намнога глыбей закаранілася ў мазгах парафіян, чым рэальна ў зямлі. Раней, калі я пытала ў мястэчку пра каталіцкія могілкі, мяне кіравалі ў частку „за ровам". Гэты роў, улічваючы ўзаемны недавер, уяўляўся мне каналам шырынёй найменш у пяць метраў. У сапраўднасці „роў" выглядаў як непрыкметная, парослая травой баразёнка. Па адным і другім баку агромністай (2,2 гектара) некраполіі намагільныя помнікі пазначаны больш-менш такімі самымі прозвішчамі. Сярод пакойнікаў, па абодвух баках, спачываюць Салаўі, Гарбачы і Казлоўскія... Рызыкоўна нават казаць, што тут лінію падзелу вызначаюць алфавіт і сімволіка. Праўда, праваслаўны бок у большай сваёй частцы пазначаны кірыліцай і крыжам св. Андрэя (з дзвюма — простай і дыяганальнай — перакладзінамі). У наш час, дарэчы, складана знайсці праваслаўныя могілкі без польскіх надпісаў. У Ялоўцы, у самай старой частцы праваслаўных могілак, побач сябе ляжалі мініяцюрныя каменныя крыжыкі з XIX стагоддзя з польскімі і рускімі надпісамі. На адным з іх я расшыфравала знаёмы надпіс: „Tu spoczywa ciało Piotra Sołowieja, zm. w 1888 roku". Далей, пад каменным крыжам, спачываў прах Фёдара Кандратюка.

Ці не тут пачаткова знаходзіўся шляхецкі квартал з магіламі Каліноўскіх? Такую думку падказваў і фрагмент старога муру, які напамінаў руіну сямейнай магільні, або фрагмент моцнай, трывалай агароджы. У каталіцкай частцы прозвішчы Каліноўскіх і Рыбінскіх увогуле не спатыкаюцца (у праваслаўнай былі Каліноўскія: Екацярына памерлая ў 1932 г. і Міхал, які жыў у 1869-1953 гадах).

— Дарэмна шукаеце магіл з першай паловы XIX веку. У нас такія не захаваліся, — інфармуе мяне пробашч рымска-каталіцкай парафіі Гжэгаж Балтручук.

Сучасны могільнік заснаваны ў 80-х гадах XIX стагоддзя. Спачатку хрысціян хавалі ў адным месцы, пасля 1918 года была выдзелена асобная частка для католікаў. Ці не тады ялоўскую некраполію пазначылі „ровам"? Бо каталіцкая і праваслаўная парафіі ў Ялоўцы вядомыя ўжо з XVI стагоддзя. У 1545 г. кароль Жыгімонт II Аўгуст (у Ялоўцы ўсе каралі пазначаныя выключна як „польскія"), за намовай маці, каралевы Боны, прысвоіў мястэчку магдэбургскае права і пячаць. Тады, менавіта, была вызначана новая планіроўка горада, якая захавалася да нашых дзён і здзіўляе сваёй дасканаласцю.

— А ці вядомае месца, у якім раней знаходзіліся гарадскія могілкі?

Пробашч Балтручук, самая вопытная асоба ў Ялоўцы, пацiснуў плячыма:

— Być może znajduje się ono pod naszymi nogami, — адказаў.

Я глянула пад ногі, дзе распасціраўся выстрыжаны ксяндзоўскі панадворак, прыаздоблены шыпшынай, сібірскімі елкамі і сплеценым з бярозы аленем. Насупраць, на франтоне касцёла, узведзенага ў 1859-1862 гадах, быццам жывая, красавалася выява Арханёла Міхала ў наіўным стылі. Будынак у візантыйскім стылі, пераходзіў з рук у рукі, больш за паўвеку служыў як праваслаўная царква. Пасля 1918 года памянялі купалы і перарабілі храм на патрэбы рымскіх католікаў.

У міжваенны час у мястэчку дзейнічалі аж два касцёлы (неагатычны касцёл св. Антонія Падуанскага праіснаваў з 1915 па 1944 год, калі быў узарваны немцамі). У адным з іх служыў беларускі ксёндз-паэт Янка Семашкевіч, які пад псеўданімамі Янка Быліна, Я. Ялавец дасылаў у беларускую каталіцкую прэсу свае вершы. Гэты факт, як і хрост кіраўніка Студзеньскага паўстання ў Літве і Беларусі, у Ялоўцы замоўчаны.

— Bo przecież ten stary, drewniany kościółek, w którym mogli go ochrzcić, nie zachował się, — ксёндз Гжэгаж не скрываў сумненняў. — A może go w Świsłoczy ochrzczono?!

*(працяг будзе)*

## 05.09 — 11.09

**(22.03. — 20.04.)** На пачатку тыдня будзеш звадлівы і звяглівы. 5-9.09. — партнёр будзе захоплены тваімі новымі ўмеласцямі; гэта таксама добры час, каб яго пераканаць да таго, на чым табе найбольш залежыць. Каб атрымліваць ад жыцця, трэба штосьці даваць.

**(21.04. — 21.05.)** 5-09.09. — чакае цябе значнае вылучэнне! Будзеш дапушчаны да тайны, якую ведаюць нямногія. 5.09. будзь асцярожны ў падарожжы. Настрой паправяць блізкія.

**(22.05. — 22.06.)** З 9.09. (да 13.09.) будзеш мець вялікую ахвоту на секс. Рушыш на любоўныя заваёвы і перажывеш шалёную прыгоду. 5.09. старайся лішне не крытыкаваць. Не парывай кантактаў з-за абы-чаго; усё паладзіцца.

**(23.06. — 23.07.)** Калі ўклеішся ў раман (9-13.09.), можаш зруйнаваць лады ў сваёй пары. Добры час на ініцыяванне адважных мерапрыемстваў. Затое твая хата можа замяніцца ў міні-гасцініцу.

**(24.07. — 23.08.)** З 10.09. (да 14.09.) убачыш перад сабой новыя фінансавыя магчымасці. Але з 9.09. (да 17.09.) некарысныя канфігурацыі зорак: фрустрацыя, незадавальненне, вывалаканне старых жаляў і прэтэнзій, аб якіх лепш забыць. Варта засяродзіцца на найважнейшым, а пакуль адкласці дробнае і тое, што можа пачакаць. Будзеш сустракацца толькі з тымі, каго любіш.

**(24.08. — 23.09.)** З 9.09. (да 13.09.) справішся з рознымі перашкодамі, будзеш канкрэтны, практычны, не змарнуеш каштоўнага часу. А грошай прыбывае... Твая цярпліваць і паслядоўнасць прынясуць добрыя вынікі.

**(24.09. — 23.10.)** 5-9.09. можаш спакойна рэалізаваць свае планы. Выкажашся цярплівасцю, што ў шмат якіх сітуацыях захавае цябе ад рызыкі. З 9.09. (да 13.09.) будзеш пад уплывам апазіцыі Венеры з Юпітэрам, і хоць гэта не прадвяшчае катастрофы, можаш выдурніцца!

**(24.10. — 22.11.)** Ад 9 да 13.09. пазбягай важных сустрэч, не абяцай іншым зашмат і не будзь зайздросным. Твая пара стане пад пытальнікам. З 11.09. згінуць твае праблемы і твой шлях будзе лягчэйшы. Паявяцца новыя магчымасці. Дзякуючы агромнай сіле волі, здабудзеш больш, чым сабе ўяўляеш. Засяродзішся на найважнейшым.

**(23.11. — 22.12.)** Будзе добра ў сям'і, у суседстве і ў падарожжы. З 9 (да 13.09.) не пераацэньвай сваіх магчымасцей і не рабі далёкіх планаў. Глядзі на сябе і свае справы рэалістычна. Будзеш таксама схільны да непатрэбнай рызыкі.

**(23.12. — 20.01.)** Будзеш клапаціцца аб дом і блізкіх. Ды наезд гасцей можа быць над твае сілы! Ды не хавайся, не пазбягай кампаніі, асабліва з былымі калегамі. На працы засяродзься на тым, што робіш і падгані хвасты.

**(21.01. — 19.02.)** Спачатку будзеш вельмі дынамічны і зможаш зрабіць штосьці важнае. Ды не натужвайся, памалу вяртайся да пасляканікульнага жыцця. У пачуццях не ўсё так, як табе хацелася б. На працы можаш паказаць сваю ўсёбаковасць і вялікую энергію.

**(20.02. — 21.03.)** Новыя нагоды і магчымасці. Усе справы ўбачыш як на далоні. Энергіі ў першай палове верасня незашмат, дык не натужвайся і бяжы да доктара, калі што няладна са здароўем. Чакае цябе сапраўдная дамапога знаёмых.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960